Выбары ў Радыё Марыя — ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Лёс чалавека, Гарадок ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 20 (2662) Год LII Беласток, 20 мая 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Малітвенны фестываль

Жаночы хор Акадэміі тэатра і прыгожых мастацтваў „Рэнесанс" з Кішынёва

Малітвеннасць, канцэнтраванасць, вытанчанасць... Музычны дыялог стыляў і стагоддзяў. Нацыянальная разнаколернасць і сусветная класіка. Адораная прыгажосць, прафесіяналізм і аматарскасць у прамым значэнні. Гэта першыя словы, якімі можна ахарактарызаваць XXVI Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі — Гайнаўка 2007. На працягу тыдня (6-13 мая) у Беластоцкай філармоніі запрэзентавалася 25 хораў са Славакіі, Балгарыі, Сербіі, Малдавіі, Украіны, Казахстана, Расіі, Латвіі, Літвы, Беларусі, Польшчы...

Найбольш хораў прыехала з Украіны. З суседняга Луцка і Тарнопаля, са сталічнага Кіева (тры хоры), Вінніцы, Крывога Рога. Украіна — гэта музычна-рэлігійны феномен, прытым з нацыянальным абліччам — большая частка рэпертуару была на іх роднай мове. Харысты выконвалі не адно ўкраінскіх кампазітараў (Лэсі Дзічко, Ірыны Шаўчэнкі, Віктара Тымажынскага, Кірылы Стэцэнкі ды ананімныя творы) — на мову Тараса Шаўчэнкі яны пераклалі творы рускіх класікаў (Дзмітрыя Бартнянскага і Пятра Чайкоўскага). Цікава, што за іх прыкладам ідуць польскія выканаўцы, напрыклад, „Аксіён" з Легніцы.

Падобны падыход запрэзентавалі харысты з Малдавіі. Іх рэпертуар на румынскай мове быў свайго роду рэлігійным падарожжам ад сярэдневякоўя па сучаснасць Малдовы і Румыніі. Жаночы хор Акадэміі тэатра і прыгожых мастацтваў „Рэнесанс" з Кішынёва, лаўрэат першага месца, выступіў у этнічных касцюмах (падобных на нашы палескія). На сваёй мове праслаўлялі Усявышняга балгары і сербы. Славакі ўключылі ў сваю праграму творы на ўкраінскай мове. Расіяне запрэзентавалі кампазіцыі на грэчаскай мове. А самы цудоўны хор „Ніжні Ноўгарад" (першае месца сярод прафесійных хораў) атрымаў спецыяльнае вылучэнне за найлепшае выкананне „Ныне отпущаеши" Караля Шыманоўскага. Наколькі бягучы год праходзіць пад знакам Караля Шыманоўскага (170 гадоў з дня нараджэння і 125 гадоў ад смерці) амаль усе выканаўцы запрэзентавалі гэты твор. Беларусы, падобна як літоўцы і казахі, падрыхтавалі свой рэпертуар выключна на рускай мове. Апошніх лёгка зразумець — большасць казахаў гэта мусульмане і рэпертуар рыхтавалі яны спецыяльна для фестывалю. Падобны падыход у літоўцаў і палякаў. Беларусы, што трэба з прыкрасцю адзначыць, запрэзентавалі сябе найбольш бледна ў т.зв. канцэрце народаў (тут бліснула Малдова!).

З другога боку выступленні суродзічаў і так успрымаліся з захапленнем. У ліку лаўрэатаў першага месца (у катэгорыі хораў музычных школ) апынуўся Жаночы камерны хор „Элегія" з Мінска. Узнік ён у 1997 годзе пры аддзяленні музыкі Педагагічнага універсітэта. У хоры спяваюць студэнты і выпускнікі гэтай установы ды выпускнікі Кансерваторыі. У рэпертуары мінскіх спявачак руская і заходнееўрапейская сакральная музыка — ад сярэдневяковых распеваў да сучасных кампазіцый, нацыянальная і свецкая музыка, джаз. З 2004 года хорам кіруе Алена Ісайкіна.

— Царкоўная музыка для нас па душы, — кажа дырыжорка Алена Ісайкіна, — бо мы амаль усе праваслаўныя. Аднак канкрэтным штуршком для вывучэння рэлігійнага рэпертуару з'яўляюцца фестывалі царкоўнай музыкі. Гайнаўскі фестываль самы прэстыжны, усе хоры мараць праверыць тут свае сілы.

З Беларусі выступілі тры хоры. Апрача згаданых лаўрэатаў запрэзентаваліся яшчэ „Гродзенская капэла" (лаўрэат трэцяга месца) і Жаночы хор Петрыкаўскай дзіцячай музычнай школы ў Петрыкаве.

Варта адзначыць яшчэ згаданую на пачатку з'яву. Хоць хоры прыехалі з далёкіх і часам экзатычных краін, усе яны быццам змовіліся — усе паставілі на сцішанасць, вытанчанасць і канцэнтраванасць напеваў. Сам гала-канцэрт напамінаў адну, распісаную ў часе і прасторы малітву.

— Мы ўсе шкадуем, што фестываль не адбываецца ў царкве, — сказала прадстаўніца Міністэрства культуры РП, якая ўзнагародзіла ініцыятара і дырэктара Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі Міколу Бушко. Стваральнік найстарэйшага і самага прэстыжнага ў свеце фестывалю царкоўнай музыкі Мікола Бушко, ураджэнец падгайнаўскіх Навасадаў, пад гучныя апладысменты публікі атрымаў самы прэстыжны ведамасны медаль „Gloria Artis". Прытым атрымаў ён дэкларацыю міністэрства аб далейшай падтрымцы.

Якраз 13 мая пачынаўся і другі Фестываль царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы. У час адкрыцця епіскап Міран неспадзявана заявіў:

— Мы ўсе молімся, каб Фестываль царкоўнай музыкі аб'яднаўся і каб быў адзін...

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Канферэнцыя кангрэсменаў ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У нядзелю, шостага траўня, у старадаўнім Гродне адбылася абласная канферэнцыя дэлегатаў Кангрэса аб'яднаных дэмакратычных сіл. Зусім нядаўна, у Вільні, партыйныя кіраўнікі рэспубліканскага роўню і прадстаўнікі рэгіёнаў пагадзіліся між сабой, што будзе карысным правесці такія сустрэчы па ўсіх абласцях Беларусі. І на гэтых спатканнях, шляхам тайнага галасавання, дэлегаты мусяць вызначыцца з тымі кардынальнымі і важнымі пытаннямі, якія трэба на Кангрэсе разгледзець...

Каб бацькаўшчына аставалася сямейнікам ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Арэшкаўскі хутар Красніца, які афіцыйна называюць Сасноўкай, абапіраецца аб прыватны лес, што далей пераходзіць у Белавежскую пушчу. У невялікіх драўляных дамах жывуць старэйшыя людзі, якіх дзеці найчасцей выехалі на пастаяннае жыхарства ў гарады. Сённяшнім пенсіянерам надаядала змагацца з лясной звярынай, якая пастаянна нішчыла пасевы і можа таму яны не надта намагаліся затрымаць на гаспадарках сваіх дзяцей. Аднак за больш чым паўвека людзі зжыліся з лесам і цяпер не хацелі б памяняць свайго хутара нават на багатае сяло. Драўлянымі хаткамі ў Красніцы зацікавіліся таксама турысты, што ездзяць па прыпушчанскіх сёлах, шукаюцы таннага жылля, у якім маглі б адпачываць у час летніх водпускаў...

Духовыя разлады ☞ 9

Ілона КАРПЮК

Нашы ўяўленні правяраюцца жыццём. Бывае так, што не спадзяемся, а часта нават і не хацелася нам б ведаць больш за тое, што здаецца нам верагодным, сапраўдным і натуральным.

Шмат гадоў, можа пад дваццаць, наглядаю што і як адбываецца ў час Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі, большасць жыцця ў Гайнаўцы, а цяпер, пасля ўзнікнення там другога фестывалю, сачу таксама за ходам фестывалю, перанесенага ў Беласток дзякуючы рашучасці ягонага дырэктара і стваральніка ў адной асобе — Міколы Бушко...

Бульба прапала! ☞ I

Ева СЦЕПАНЮК

Народная прыказка, быццам *ад крадзенага не патаўсцееш*, зусім не прыстае да Чабутковых. Наадварот, у сямейцы ўсе маюць падвойныя падбародкі. Адзінае выключэнне — гаспадынька, якую з-за выгляду, а яшчэ больш з-за характару, празываюць у Н. *блядзь худая*. Жыццёвая мудрасць гэтай мізэрнай кабеціны зводзіцца да адной фразы:

— Трэба ўмець камбінаваць...

9 770546 196000

Канферэнцыя кангрэсменаў

У нядзелю, шостага траўня, у старадаўнім Гродне адбылася абласная канферэнцыя дэлегатаў Кангрэса аб'яднаных дэмакратычных сіл. Зусім нядаўна, у Вільні, партыйныя кіраўнікі рэспубліканскага роўню і прадстаўнікі рэгіёнаў пагадзіліся між сабой, што будзе карысным правесці такія сустрэчы па ўсіх абласцях Беларусі. І на гэтых спатканнях, шляхам тайнага галасавання, дэлегаты мусяць вызначыцца з тымі кардынальнымі і важнымі пытаннямі, якія трэба на Кангрэсе разгледзець.

Галоўная праблема, вакол якой разгараюцца жарсці і спрэчкі, гэта, як заўсёды, праблема лідэрства. Паўтараць пытанне, якое было ўнесена на гэтую тэму ў бюлетэнь для тайнага галасавання, няма сэнсу. Яно складзена так, што нават некаторыя палітычна дасведчаныя кіраўнікі раённых структур не змаглі без дадатковага тлумачэння зразумець яго сэнс. Можа таму, каб кангрэсмены канчаткова не заблыталіся ў сваёй місіі, сябрам некаторых партый раздалі ўзоры. Там чорным па белым было размалявана як правільна і насупраць якога радка трэба паставіць галачку. І як не дзіўна, многія партыйцы не палічылі гэта ні асабістай абразай, ні тым, што іхныя лідэры лічаць сваіх калег па партыі дэбіламі, і старанна выканалі загад кіраўніцтва, грызмольнуўшы асадкай там, дзе сказалі.

Ну а калі гаварыць чалавечай мовай, то галоўнае пытанне гучыць так: Патрэбны ці не зараз беларускай аб'яднанай апазіцыі адзіны кіраўнік? Калі патрэбны, то яго трэба абраць. А калі не — то не. Тады паўнамоцтвы прымаць важкія рашэнні трэба перадаць кааліцыйнай структуры.

Па гэтай тэме ўжо праходзілі нарады і сустрэчы. Таму ўсе аргументы „за" і „супраць" дэлегаты даўно чулі ад сваіх партыйных босаў. Змяніў сваю пазіцыю на супрацьлеглую толькі кіраўнік БНФ Вінцук Вячорка. Яшчэ нядаўна ён выступаў супраць абрання лідэра. Але пасля, калі адзін з галоўных прэтэндэнтаў на гэтую пасаду Аляксандр Мілінкевіч падтрымаў яго план „Кампраміс дзеля адзінства" і пагадзіўся на абмежаванне паўнамоцтваў старшыні Палітсавета, Вячорка схіліўся да ідэі абрання адзінага. Яго ідэю падтрымаў і сам Аляксандр Мілінкевіч, і старшыня БСДГ Станіслаў Шушкевіч. Супраць выступіў прадстаўнік партыі сацыял-дэмакратаў Аляксандра Казуліна Алег Рынкевіч, прадстаўніца камуністаў Алена Скрыган, кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька і прадстаўнік БНФ, які скарыстаў сваё права меншасці не пагадзіцца з рашэннем Сойма сваёй партыі, Юры Хадыка. На думку апошніх, лідэра не выбіраюць. Ім становяцца. А проста арыфметычна кіраўнік, ды яшчэ абраны невялікай перавагай галасоў, толькі ўнясе раскол у шэрагі Аб'яднаных дэмакратычных сіл. І трэба на гэтым этапе дбаць пра войска, а не пра выбары генерала.

Расколам палохалі і выступоўцы за абранне адзінага. Маўляў, як такога не будзе, то ўсе ўдзельнікі АДС зоймуцца сваімі вузкапартыйнымі пытаннямі. Бо без камандзіра войска гіне.

Партыйныя ж кіраўнікі абласнога роўню яшчэ напярэдадні гэтага сходу прынялі рашэнне не ўдзельнічаць у спрэчках, каб не пасварыцца між сабой і такім чынам паспрыяць захаванню сваёй абласной кааліцыі.

Другое па значнасці пытанне, якое выклікала вялікую зацікаўленасць дэлегатаў, гэта разбурэнне гістарычнай часткі Гродна. Выступоўцы давялі прысутным пра масавыя, стыхійныя і арганізаваныя акцыі пратэсту гродзенцаў, што змагаюцца за захаванне старадаўняга аблічча свайго горада. Прысутныя прагаласавалі за хадайніцтва перад аргкамітэтам, каб гэтае пытанне было ўключана ў парадак правядзення Кангрэса і прынялі заявы з патрабаваннямі спыніць археалагічнае злачынства.

А пасля абвяшчэння вынікаў тайнага галасавання (за абранне адзінага лідэра — 29 чалавек, супраць — 26) і сталічныя кіраўнікі, і рэгіянальныя кандыдаты паспяшаліся раз'ехацца па сваіх справах. Іншых людзей, якія хадзілі па вуліцы, зусім не цікавіла што там робяць дэлегаты Кангрэса і якія пытанні разглядаюць. Яны пра гэта нічога і не ведалі.

А на гэты раз мерапрыемства апазіцыянераў не зацікавіла нават ні КДБ, ні міліцыю. Прынамсі іх прадстаўнікоў хіба што ўпершыню за ўсю гісторыю правядзення апазіцыйных сходаў такога роўню ніхто не заўважыў.

Віктар САЗОНАЎ

Усяму віной... камуна

Многа клопатаў і бед паходзіць у нас ад нядобрасумленнасці і фальшывасці нашых палітыкаў і чыноўнікаў. Чаму, напрыклад, так многа злосці і нянавісці ў іх да пакойніцы Народнай Польшчы і яе былых (цяпер ужо старэнькіх, слабенькіх) функцыянераў? — часта думаю я. І даходжу да вельмі сумных вывадаў.

Бо менавіта такім спосабам найхутчэй і без большых намаганняў і розуму можна ў нас заіснаваць у палітыцы, стаць відочным, знаным — гэта па-першае. Палітыкі ж з большым стажам ненавідзяць так званай камуны, бо, часцей за ўсё, яны самі ці блізкія іх грашылі ёю — былі ў свой час палітычнымі актывістамі і партыйнымі дзеячамі. Палітычнай жа кар'еры не ўдалося ім тады зрабіць, значыць, асталося толькі зненавідзець камуну — гэта па-другое. Яшчэ іншыя, па той ці іншай прычыне, сталі тады агентамі палітычнай паліцыі. І таксама замнога на гэтым не зарабілі, а пракамуністычнае кляймо робіць клопатаў ім нямала. Былі ж імі, аказваецца, і палітыкі, і журналісты, і пісьменнікі, і артысты, і духавенства, і нават арыстакраты. Як жа ж ім любіць цяпер камуну і камуністаў? — гэта па-трэцяе. Ну і звычайная людская зайздрасць: чаму ім удалося тады зрабіць кар'еру, а мне, напрыклад, не — гэта па-чацвёртае.

Было нямала і іншых прэтэнзій да былой народнай улады. Нават нярэдка тых, якія былі моцна абласканыя ёю ў свой час. І таксама правільна, гэтай жа ўлады ўжо даўно няма і, значыць, не зможа яна сама абараніцца. Сучасная наша лявіца таксама не адважыцца яе бараніць, а пункты на крытыцы яе зарабіць можна.

Крытыкаваць былую народную ўладу, канешне, трэба, і ёсць за што, але ж не татальна за ўсё, як у нас гэта робіцца. Крытыкаваць таксама трэба і многіх нашых грамадзян. Раней актыўныя, адданыя сацыялістычнай уладзе, пасля змены яе капіталістычнай, раптоўна і яны пачалі змяняць свае колеры і погляды на розныя справы. Напрыклад, на шлюб.

Народная ўлада, канешне, агітавала за цывільныя шлюбы. Афіцыйна лічылася тады, што ўсе свядомыя людзі заключаюць толькі цывільныя шлюбы. Але не саджалі ў турму і тых, хто яшчэ і звянчаўся ў касцёле ці царкве. Сучасная наша ўлада наадварот, вельмі падазрона глядзіць на тых, хто няхрышчаны, не браў ці не бярэ касцельнага шлюбу, ці замешаны ў іншых справах нямілых духавенству.

Вось і прэ народ (веруючы ці няверуючы, хрысціянін ці не) у касцёлы вянчацца ці хрысціць сваіх дзетак. І ў гэтым, канешне, няма яшчэ бяды: няхай вянчаюцца, размнажаюцца, хрысцяцца і жывуць на здароўе.

Смяшней аднак робіцца, калі дзед з бабкай, пражыўшы з сабой год трыццаць і больш без касцельнага шлюбу, раптам рашылі павянчацца. Бо ўсе гэтыя гады — па іх расказах — моцна грызла іх святое сумленне, што жывуць у грэшным, цывільным саюзе. Але і за гэтым насілу згадзіцца б можна, калі б гэта была праўда. Халера пачынае браць чалавека, калі пачуе, што віноўніцай свайго грэшнага сужыцця яны лічаць не сябе, барані Божа, а народную ўладу, якая быццам не дала ім звянчацца. Шаноўнай жа гэтай парай з'яўляецца не абы-хто, а генерал з генеральшай ці хтосьці падобнага рангу.

ПАРП нібыта і была атэістычнай партыяй, але ўжо члены яе, у большасці сваёй, не. Усе аб гэтым ведалі і за рэлігійныя перакананні, хрышчэнні, вянчанне — паўтараю яшчэ раз — у турму ў нас не саджалі. Найбольшай карай магло быць выключэнне з партыі. А гэта ў сваю чаргу магло, канешне, ім зашкодзіць у кар'еры. І былы сяржанцік мог і не стаць генералам. Вось і ўся тут філасофія. Калі стаў, значыць, важнейшая яму была камуністычная кар'ера, як рэлігійныя перакананні...

Усё гэта я знаю з досведу. Няраз я сам хрысціў дзетак партыйцаў у касцёле ці царкве і дастойна трымаў шлюбны вянец над партыйнай галавою. І нічога гэтым галовам не сталася — надалей працавалі і авансавалі, па партыйнай лініі таксама. Значыць, народная ўлада большай віны за іх паступкі не бачыла. Я таксама не бачыў. І не бачу. Не лічыў і не лічу іх горшымі ад былых беспартыйцаў.

Віну і грэх бачу за тымі, хто дзякуючы сваёй партыйнасці зрабілі тады кар'еры, а цяпер, замест паставіць за камуну грубую свечку, лічаць сябе пакрыўджанымі ёю і ўсе грахі звальваюць на яе. Яны абманулі камуну, абманваюць сучасную ўладу і грамадства, і абманваюць Усявышняга...

Прысвячаю ім філасофскую байку.

Сібірскі мароз. Наляту замярзае верабейчык і мёртвым падае на зямлю. Праходзіць карова і робіць купку якраз на вераб'я. Разагрэты купкай верабей ажывае і з радасці, што ажыў, падняў галоўку і зачырыкаў. Чырыканне пачула кошка, кінулася на вераб'я, выцягнула з г..., задушыла і з'ела...

Мараль: калі сядзіш у г..., то не чырыкай...

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

На абочыне люстрацыі

Перажылі мы — як думаю — першую адслону спектакля, званага люстрацыяй. Канстытуцыйны трыбунал (КТ) аспрэчыў шмат якія асноўныя пункты люстрацыйнага закону. Тым не менш пасля яго ўхвалення Сеймам, а нават раней, пасля таго як да грамадскага ведама дайшоў г.зв. спісак Вільдштэйна, шмат паўсюдна вядомых персон, удзельнікаў публічнага жыцця, аказаліся быць „героямі" агентурнай рэчаіснасці Польскай Народнай Рэспублікі. Не буду тут пералічваць іх позвішчаў, бо спісак быў бы доўгі. Амаль штодзень, неяк быццам бы выпадкова, сродкі масавай інфармацыі выкрывалі чарговыя прозвішчы, прытым гэта было, мабыць, не без удзелу Інстытута нацыянальнай памяці. Дзень да пастановы КТ ашарашыў мяне аднак Сакрат Яновіч. На старонках „Кур'ера параннага" таксама і ён прызнаўся да таго, што быў тайным і свядомым супрацоўнікам Службы бяспекі ў 1958-1970 гадах. Тлумачыўся ён:

— Я нікога не пакрыўдзіў, але даўся ўблытацца, гэта нядобра. Я задаволены гэтай авантурай, бо ўрэшце пакінуць мяне ў спакоі. Будуць паўтараць: эсбек, агент і ніхто не зверне ўвагі на гэтыя амаль сорак гадоў майго змагання. У кожнага свая рацыя.

Без сумнення, гэта годна, што Сакрат Яновіч прызнаўся да супрацоўніцтва, без круцельстваў, што мела месца ў выпадках іншых вядомых людзей, свядома або выпадкова заблытаных у супрацоўніцтва з былымі службамі бяспекі. Ёсць, аднак, памылкі, хоць бы тыя з часу маладосці, за якія адказваеш усё жыццё. У выпадку Сакрата Яновіча, але, мабыць, і некаторых іншых асоб, супрацоўнічаўшых з УБ і СБ, найгоршае гэта тое, што мусіць ён у пажылым узросце не толькі жыць з дакорамі сумлення, але праўдападобна падвергнецца публічнаму маральнаму лінчу. Можа, будуць яму адабраны ўзнагароды, хоць бы тая падляшскага маршалка, якую ўручыў яму СЛДоўскі маршалак папярэдняга тэрміну. Можа тут пажартаваць: *Kto daje i odbiera, ten się w piekle poniewiera.* Ды жарты ў гэтым выпадку не на месцы. Думаю, Сакрат Яновіч перажывае сапраўднае пекла. А так, дарэчы, цікава, колькі цяпер мясцовых і агульнапольскіх журналістаў адважыцца скантактавацца з пісьменнікам з Крынак і, як дагэтуль бывала, папрасіць выказаць сваю думку на розныя справы. А ж Сакрат Яновіч з-за прызнання і тлумачэнняў з супрацоўніцтва з СБ не перастаў быць выдатным пісьменнікам. Не перастаў быць мудрым інтэлектуалам, аналізуючым разнавідныя аспекты жыцця, не толькі з беларускага пункту гледжання.

Два дні пасля публікацыі ў „Паранным" аж закалаціла мною пасля таго, як я пачуў, што выконваючы абавязкі падляшскага маршалка Яраслаў Схабенскі рашыў вярнуць даваенную назву беластоцкаму драмтэатру. І такім чынам ён зноў носіць імя маршалка Юзафа Пілсудскага. А гісторык Іаланта Шчыгел-Рагоўская ў Тэлебачанні Беласток даказвала (хоць дакументаў на тое няма, а прынамсі ў польскіх архівах), што папярэдні патрон тэатра — Аляксандр Вянгерка — быў савецкім шпіёнам. А я згодны з дырэктарам драмтэатра, які напамінае, што ў час дырэктарства Вянгеркі, у час акупацыі Беласточчыны саветамі, п'есы ставіліся тут папольску, а нават выконваўся польскі гімн. І што на маю думку найважнейшае, я не ведаю тэатра імя якога-небудзь палітыка. Тэатры носяць імёны творцаў у гэтай галіне мастацтва. Калі пойдзе ўсё такім шляхам, ужо магу ўявіць, што на Падляшскім музеі ці Падляшскай бібліятэцы будзе красавацца імя, напрыклад, Рамана Дмоўскага. А калі ўлады пойдуць яшчэ далей, можа, і братоў Качынскіх.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Падляшскія выбары ў Радыё Марыя

Гневамір Рокаш-Кучынскі

Кшыштаф Талвінскі

Можа некаму здацца дзіўным, што я — праваслаўны — слухаю Радыё Марыя. Так, ужо некалькі гадоў слухаю некаторыя перадачы, якіх не знаходжу ў іншых радыёстанцыях. Гэта надта цікавыя шматтэматычныя „Незавершаныя размовы", прысвечаныя розным аспектам палітычнага і грамадскага жыцця краіны, а таксама „Актуальнасці дня", з якіх можна даведацца пра справы, якія часта поўнасцю замоўчваюцца іншымі СМІ. Менавіта я іх слухаю і да гэтага заахвочваю іншых. А пра тое, што варта слухаць, найлепшым доказам з'яўляецца перадача, якая выйшла ў эфір ноччу 6 мая.

Менавіта тады ў перадачы „Незавершаныя размовы" адбылася ў эфіры сустрэча з трыма падляшскімі палітыкамі: Каралем Тылендам (Права і справядлівасць) ды Гневамірам Рокаш-Кучынскім і Кшыштафам Талвінскім (ПСЛ „Пяст"). Тэмай сустрэчы было пытанне дапаўняльных выбараў у Сеймік Падляшскага ваяводства. Згаданыя палітыкі прадставілі свае погляды на прычыны нечарговых майскіх выбараў, а таксама абмеркавалі цяперашнюю палітычную сітуацыю ў рэгіёне. Я не намерваюся спрачацца з іх поглядамі, тым больш, што з многімі я сам згодны. Напісаць гэтыя радкі схіліла мяне што іншае, а менавіта бязглуздыя выказванні ў эфіры былога віцэ-маршалка Падляшскага ваяводства Кшыштафа Талвінскага. Адсутнасць фармальнай адукацыі не з'яўляецца грахом, грахом з'яўляецца адсутнасць асноўных ведаў па аналізаваных сабою пытаннях. І гэты грэх згаданы палітык, дарэчы не першы раз, зрабіў.

Менавіта сказаў ён, што „грэка-каталікі, якіх пасля 1831 года прымусілі стаць праваслаўнымі", у Падляшскім ваяводстве складаюць толькі ад двух да чатырох працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва. Канешне, з тэзісамі такога ўзроўню ў прынцыпе дыскутаваць немэтазгодна, бо шкада часу. Нікога насілу не ўчыніш разумным, але паколькі справа тычыцца публічнай асобы, якая — на жаль — зноў пнецца на палітычны падсвечнік, то вядро халоднай вады на ягоную галаву будзе карысным. А прынамсі дапаможа выбаршчыкам прыняць адпаведнае рашэнне.

Адкуль вы, спадар маршалак, узялі такія лікі і дату: ці вы самі іх прыдумалі, ці хтосьці вам іх падказаў? Жыве ў Беластоку адзін прафесар (прыгадаўся мне ў гэтым месцы з'едлівы вершык, які паўтараў нямецкі канцлер Бісмарк „Vier hundert Professoren, Vaterland du bist verloren" / „Чатырыста прафесараў, айчына загублена"), які гаворыць на падобнай вам мове, але нават паводле яго гэтых бедных „грэка-каталікаў" ёсць больш. Ці вы калісьці задумаліся, хто такі грэка-каталік, чым ён адрозніваецца ад праваслаўнага і якім чынам грэка-каталікі з'явіліся на Беласточчыне? Вы пачулі звон, але не ведаеце дзе ён! І як вам язык не адваліўся, калі ў эфіры, у адказ на тэлефанаванне „Вальдэмара з Падляшша", вы сваю жонку назвалі „грэка-каталічкай"?! Спадзяюся, што прынамсі гэтага чароўная спадарыня Марыя не стрымае і аддубасіць вас качалкай. Вы гэтага заслужылі! А калі вам і гэтае прабачыць, то прыміце да ведама, што прынамсі я і даволі вялікае кола вядомых мне праваслаўных не жадаем, каб называлі нас „грэка-каталікамі". Быць грэка-каталікам не грэх, але гэта не абазначае тое самае, што быць праваслаўным. І прынамсі столькі маршалак Падляшскага ваяводства павінен ведаць. Бо калі не, то менавіта ў гэтым ваяводстве не надаецца ён да выконвання публічных функцый.

Калі гаварыць пра лік вернікаў праваслаўя на нашай тэрыторыі, то прыводжанне вамі так вельмі моцна заніжаных даных кампраметуе вашы чыноўніцкія кампетэнцыі. Адпаведныя даныя можна знайсці ў даступных публікацыях ці справаздачах некаторых аддзяленняў Ваяводскай управы. Або святочнай раніцай зрабіце сабе экскурсію ў Сямятычы, Мілейчычы ці ў іншую бліжэйшую царкву і навочна пабачце гэтыя працэнты!

А з іншай справай, закранутай Кшыштафам Талвінскім, на жаль, прыходзіцца мне згадзіцца. Праваслаўныя выбаршчыкі калісьці падтрымоўвалі СЛД, а цяпер падтрымалі Грамадзянскую платформу (прынамсі ў Беластоку). І бачу ў гэтым вялікую віну іерархіі нашай Царквы, якая па вядомых толькі сабе прычынах уключылася ў палітычную падтрымку гэтай партыі, быццам нашы вернікі гэта статак бараноў, якія ў нічым не разбіраюцца. Сам я быў сведкам таго, як пад адной з беластоцкіх цэркваў раздаваліся выбарчыя лістоўкі кандыдата ад ГП, а плакаты з яго выявай густа спярэсцілі царкоўную аграду і дрэвы вакол яе. Ужо прынамсі ў царкве маглі б нам даць адпачыць ад палітычнай прапаганды. Царства Ісуса не ад свету гэтага!

Прызнаўся спадар Талвінскі ў згаданай перадачы, што свядома давёў да неабходнасці правядзення новых выбараў, бо „лепш, хай дзяржава страціць на іх арганізацыю 3 мільёны злотых, чым мае страціць 50-60 мільёнаў у выніку памылковых рашэнняў палітыкаў Грамадзянскай платформы". Ну што ж, гэта ў нечым напамінае пазіцыю пасла Рэйтана і да таго без гарантыі, што пасля выдачы 3 мільёнаў на нечарговыя выбары гэта не ГП будзе вырашаць аб размеркаванні дзяржаўных грошай у Падляшскім ваяводстве. А што тады з іншымі ваяводствамі, а што з Варшавай? Трэба было і там сарганізаваць групы мясцовых Рэйтанаў!

І ўрэшце апошні папрок у адрас спадара Талвінскага. Гэта хвацкае падкрэсліванне свайго шляхецкага паходжання. Няма нічога дрэннага ў прыналежнасці да гэтага саслоўя, сам да яго належу, але шляхецтва не можа быць шырмай, якая скрывае нашы грахі і недахопы. Шляхецтва — з'ява ў Падляшскім ваяводстве зусім нярэдкая — гэта перш за ўсё адзін вялікі абавязак! Абавязак у адносінах да Бога, айчыны і народа. А ці напэўна кожны, хто так ахвотна экспануе сёння свой родавы герб, можа пахваліцца, што не заплямій яго? Ці не абражае шляхецкага гонару чалавек, які, адракаючыся ад сямейных традыцый, дзейнічаў у камуністычнай партыі ці бяспецы, гарантуючы сабе поўнае і стабільнае карыта? Або той, хто яўна немаральным спосабам жыцця патаптаў Божыя законы і людскія добрыя звычаі? Ніводнай плямы не бачыць ён у сваім шляхецтве? А можа лепш было б не выходзіць на людскія вочы з гэтымі сваімі (а ў сапраўднасці продкаў) традыцыямі? А пакуль пачаць свяціць у вочы дыяментам, трэба задумацца над тым, якую карысць ад мяне будзе мець дзяржава і лакальная грамадскасць, а не што выпадзе на маю долю ад гэтых выбараў. Шляхта заўсёды была першай у публічнай службе, менавіта ў службе, а не пры карыце!

І гэта было б усё ў сувязі са згаданай перадачай і выказваннямі спадара Кшыштафа Талвінскага. Хтось калісьці сказаў, што ў Госпада розныя кватаранты. У Радыё Марыя таксама розныя субяседнікі. Але можа менавіта таму гэтыя „Незавершаныя размовы" бываюць так цікавымі, што няраз канчаюцца далёка за поўнач. І шкада выключаць радыёпрыёмнік, каб урэшце легчы спаць. Горача рэкамендую гэтую перадачу, асабліва ў суботнія і нядзельныя вечары.

Марк ЦЫБАРТ

У Заблотчыне днее

У салэцтве, да якога належаць вёскі Заблотчына і Мінкоўка (яна яшчэ вядомая тут, у ваколіцы, як Беглюкі) у Нараўчанскай гміне адбыліся выбары солтыса. Жыхары гэтых вёсак абавязкі солтыса даверылі Галіне Вярхоўскай з Заблотчыны. Цяпер яна ўдзельнічае ў кожнай сесіі Гміннай рады ў Нараўцы. Выступае з пытаннямі да войта і да Рады гміны. Спадарыня Галіна хоча шмат што зрабіць для дабра ды выгаднейшага жыцця аднавяскоўцаў.

У мясцовай святліцы арганізавала яна сустрэчу з вясковымі гаспадынямі. Жанчыны прыгадалі, што яшчэ не так даўно міжсуседскае жыццё было куды лепшае, было больш узаемнай добразычлівасці ды спагады. Сяляне дапамагалі адзін другому ў палявых працах, падчас абмалотаў. Разам капалі бульбу, або касілі ці жалі жыта, церлі лён ды каноплі. Усе разам бывала, талакою. У мінулыя гады цяжэй ды бядней жылося. Суседзі не адмаўлялі адзін другому ў дапамозе. Гуртам ездзілі ў лес па дровы, а то і касіць на сенажаць.

Удзельніцы сустрэчы ў прызабытай святліцы захацелі вярнуцца да колішніх традыцый, абрадаў. Яны будуць часцей сустракацца, каб пагутарыць з сабой і адчуць сябе згуртаванымі. Гэта вельмі важнае для ўдоваў і ўсіх іншых старэйшых асоб.

Солтыс Галіна Вярхоўская робіць захады дзеля разбудовы святліцы ды добраўпарадкавання пляцоўкі ля яе. Яна намерана пабудаваць супольнымі намаганнямі аднасяльчан спартыўную пляцоўку для моладзі. У час летніх канікул прыязджае сюды шмат юнакоў і дзяўчат. І пляцоўка будзе. Ужо вядома, што з дапамогай гмінных улад. Забалатчанам жадаем поспехаў. Іх накірунак дзейнасці правільны.

(мох)

Руіны страшаць

Непадалёк чыгуначнай станцыі Кляшчэлі залягаюць руіны былых складоў Падляшскага зерневага прадпрыемства (ПЗЗ). Калісьці сяляне прадавалі тут збожжа. У рыначнай эканоміцы сталі яны непрыдатнымі. Беластоцкае кіраўніцтва Падляшскага зерневага прадпрыемства — уладальнік маёмасці — прабавала добраўпарадкаваць памяшканні, але ахвотных узяць склады ў арэнду не аказалася і давялося іх прадаць. Склады купіў прыватны прадпрымальнік. У гэтай здзелцы не было б нічога заганнага, калі б не адно „але". Пакупнік разабраў будынкі, пазабіраў больш каштоўныя рэчы і пакінуў... глыбокія ямкі ды разваліны. На руіны штодзень прыглядаюцца праязджаючыя аўтамабілямі турысты, якія падаюцца над Рэпчыцкае вадасховішча. Разваліны палохаюць таксама пасажыраў цягнікоў, паколькі гэтыя паралельна прылягаюць да чыгуначнага пуці.

Хто паклапоціцца пра гэта, каб друз быў прыбраны, а ямкі засыпаныя і руіны перасталі страшыць? Думаю, што гэта справа мясцовага самаўрада. Бурмістр горада павінен паўплываць на ўладальніка, каб гэты прывёў сваю нерухомасць у належны парадак, бо такая „візітная картачка" прыносіць сорам не толькі жыхарам вуліцы Каляёвай, але і ўсяму кляшчэлеўскаму грамадству.

Уладзімір СІДАРУК

Каб бацькаўшчына аставалася сямейнікам

Арэшкаўскі хутар Красніца, які афіцыйна называюць Сасноўкай, абапіраецца аб прыватны лес, што далей пераходзіць у Белавежскую пушчу. У невялікіх драўляных дамах жывуць старэйшыя людзі, якіх дзеці найчасцей выехалі на пастаяннае жыхарства ў гарады. Сённяшнім пенсіянерам надаядала змагацца з лясной звярынай, якая пастаянна нішчыла пасевы і можа таму яны не надта намагаліся затрымаць на гаспадарках сваіх дзяцей. Аднак за больш чым паўвека людзі зжыліся з лесам і цяпер не хацелі б памяняць свайго хутара нават на багатае сяло. Драўлянымі хаткамі ў Красніцы зацікавіліся таксама турысты, што ездзяць па прыпушчанскіх сёлах, шукаючы таннага жылля, у якім маглі б адпачываць у час летніх водпускаў. Прыезджы купіў на гэтым хутары драўляную хатку і шыкарна адрамантаваў яе, а на плошчы побач, мабыць, будзе ўзведзена новая дача. Ад дзяцей сённяшніх пенсіянераў і іншых іх сямейнікаў, што атрымаюць у спадчыну дамы і поле, будзе залежаць будучыня невялікага хутара. Калі яны не рашацца хутка прадаць бацькаўшчыну, скарыстаюць на гэтым фінансава, бо прыватная ўласнасць апошнім часам даражэе. Выхадцы з Красніцы будуць мець таксама ўплыў на клімат, які створыцца ў пасёлку, калі будуць прыязджаць сюды на летні адпачынак ці пераселяцца на пастаяннае жыхарства ў пенсіённым узросце.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Мікола Гурын многа працаваў, каб дапамагчы дзецям

Хутар Красніца ўзнік у пасляваенныя гады, калі пасля вялікага пажару ў Арэшкаве частка яго сем'яў пасялілася блізка сваіх надзелаў зямлі і лесу. Іх продкі, асочнікі з Арэшкава, першыя пасяленцы ў Белавежскай пушчы, займаліся яе аховай. Пасля людзі з Арэшкава таксама жылі з працы ў пушчы і на сельскай гаспадарцы. Хаця многія жыхары Красніцы ўжо перасталі абрабляць свае палеткі і працаваць у пушчы, не могуць спакойна сядзець у хатах. Летам збіраюць яны ягады, а восенню — грыбы. Пастаянна могуць яны захапляцца прыгожай пушчанскай прыродай, якой таксама сталі цікавіцца прыезджыя турысты. Лепшыя ўчасткі поля абрабляюць яшчэ гарадскія дзеці і гаспадары з Арэшкава, а горшае поле і лугі ляжаць ужо аблогай. Зямля, якая мяжуе з лесам, пачала сама хутка аблясяцца бярозкамі, а з іх боку асцярожна высоўваюцца з зямлі хвойкі. Можа быць гэта ідэальнае месца для гараджан, што пранікаюць у нашыя вёскі ў пошуках хатак. Калі на вёсках паміраюць адзінокія людзі, часта іх сямейнікі не могуць рашыцца каму аддаць маёнтак, а калі хочуць хутка атрымаць прыбытак ад сваёй спадчыны, тады стараюцца прадаць супольную ўласнасць і падзяліцца грашыма. Такім чынам узнікае магчымасць танна прыдбаць дом на вёсцы і часта гэтай нагодай карыстаюцца прыезджыя, бо ў мясцовых няма дастатковага капіталу. У Красніцы адзін дом прадалі ажно жыхару Лодзі. Усе астатнія жыхары яшчэ моцна прывязаны да сваіх хатаў і пэўна хацелі б, каб іх маёнткі на доўгія гады служылі сямейнікам.

— Жывуць у Красніцы тры ўдавіцы і тры старэйшыя сужонствы. Хаця нашы дзеці выехалі, не забываюць нас, прыязджаюць і наглядаюць за патрабуючымі, — кажа Мікола Гурын, які часта кантактуецца з сынам, што жыве ў Арэшкаве.

— Калі бацькі паўміралі, дом пасуседску адрамантаваў іх зяць з Беластока, які часта прыязджае да нас. Проста перасыпаў ён хатку і паддашак прыстасаваў для жыллёвых патрэб. Жонка яшчэ працуе і таму радчэй наведвае нас, але мужык любіць жыць побач лесу. Паветра чыстае, а пушча прыцягвае. Ён і сёння нешта рабіў на панадворку.

Іншым суседам спадарства Гурынаў з'яўляецца жыхар Лодзі, які многа энергіі ўклаў, каб памяняць вонкавы выгляд купленай хаты. Адрамантаваў ён дом усярэдзіне і падключыўся да водаправода, каб зрабіць сабе больш выгадным побыт у Красніцы.

— Аднак наш сусед з Лодзі рэдка сюды прыязджае. Часам толькі нагляне за хатай, але і тады мала кантактуецца з мясцовымі жыхарамі. На абеды ездзіць ён у агратурыстычную кватэру ў Лазіцы і там забяспечваецца прадуктамі, — тлумачыць спадар Гурын.

— Раней у гэтым доме жыло маладое сужонства, якое прыбыло з Польшчы і хацела купіць хатку, але пасля адмовіліся ад здзелкі. Яны вельмі цікавіліся вясковым жыццём, прыходзілі да нас за малаком і ахвотна з намі размаўлялі. Толькі іх сабак мы апасаліся. Бывала, што ўцякалі яны з панадворка і бегалі па палях. Маглі ж накінуцца на нашых кароў, якія пасвіліся збоку, — кажа Ніна Гурын, жонка Мікалая. — Плошчу, распаложаную збоку і прыстасаваную да забудовы, купіў жыхар Беластока. Добрае гэта месца для адпачынку і распаложанае блізка лесу. Даведзены былі да ўчастка, размерам у 0,6 гектара, электраэнергія і водаправод. Таму пакупнік заплаціў за яе ажно 36 тысяч злотых.

Суразмоўцы з Красніцы заяўляюць, што цана зямлі побач Белавежскай пушчы стала павышацца. Аднак многія жыхары Красніцы перапісалі свой маёнтак на дзяцей, а продаж зямлі стрымалася пасля ўвядзення даплатаў да сельскагаспадарчай прадукцыі, якія выдзяляюцца на апрацаванае поле.

— Наша суседка перапісала хату на дачку, а іншыя жыхары — таксама на дзяцей, — гаворыць Мікола Гурын. Так як іншыя мужчыны з Красніцы цяжка працаваў ён на дзяржаўнай пасадзе. Жонка Ніна займалася дзяцьмі, гадоўляй кароў, свіней і авечак. Цяпер складана было б расстацца з гаспадаркай збудаванай такой цяжкай працай.

— Я працаваў у лесе, рабіў на складзе драўніны і ў кацельнях. Прыходзілася на дарогах працаваць, вазіць з лесу будаўнічы матэрыял і дровы. Вярнуўшыся дамоў, трэба мне было рабіць на полі, а ноччу сачыць, каб дзікі не знішчылі бульбу або збожжа, — кажа Мікола Гурын.

— Калі я вяртаўся з работы, бывала што не было часу абед з'есці. Браў я ў руку кусок хлеба і бег на поле, каб перад змярканнем справіцца з работай. Прыходзілася таксама араць пры ліхтарыку і выконваць іншыя палявыя работы ноччу, — успамінае Міхал Парфянюк, які будаваў дарогі ў наваколлі Гайнаўкі, Бельска-Падляшскага і Сямятыч. Яго жонка Вера працавала дома, займаючыся гаспадаркай. Разам з мужам збудавалі яны дом і гаспадарчыя будынкі. Пасля сталі дапамагаць дзецям у Гайнаўцы. Маладыя яшчэ прыязджаюць у Красніцу і абрабляюць атрыманае ў спадчыну поле, а ўнукаў таксама цікавіць спакойнае месца каля Белавежскай пушчы.

Мае субяседнікі звяртаюць асаблівую ўвагу на цяжкасці, якія трэба было ім пераадолець гаспадарачы побач лесу.

— Стараліся мы абгароджваць сваё поле і сабак гадавалі, якія мелі палохаць звярыну і ўсё ж такі не маглі абараніцца ад дзікоў ці аленяў. Калі нарастала бульба, цэлымі ночамі трэба было сядзець пад лесам, а сёння гэтае поле непатрэбнае нікому і пачынае зарастаць лесам, — з сумам гаворыць Ніна Гурын. — Праўда, расло там толькі жыта, мяшанка ды бульба.

Лепшае поле ў Красніцы распаложанае ў напрамку Арэшкава і там нават цяпер паяўляецца пшаніца. Кусты пачалі расці не толькі на лугах побач лесу, але і ў равах, якія капалі дзеля асушэння пашы. Сена было патрэбнае для кароў і авечак, якіх гадоўля цяпер амаль спыненая. На хутары гадуецца адна карова і за малочнымі прадуктамі трэба дабірацца ў распаложанае непадалёк Арэшкава.

Мае суразмоўцы з Красніцы, так як многія іншыя прыпушчанскія жыхары, выказваюцца супраць пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку на тэрыторыю ўсёй пушчы, але не ведаюць падрабязнасцей новага праекта, што распрацоўваецца пад патранатам прэзідэнта РП Леха Качынскага. Міхал Парфянюк задумваецца, ці можна будзе збіраць у парку грыбы або прывозіць адтуль дровы.

Аляксей МАРОЗ

Аб чым гаворыць у ГСе

У 1950-х гадах па ўсёй краіне ўзніклі Гмінныя кааператывы — ГСы (Gminne Spółdzielnie „Samopomoc Chłopska”), якіх асноўнай задачай стала арганізацыя гандлёва-паслуговай сеткі ў вёсках і мястэчках. Аднак не надта якасныя былі тыя кааператывы, калі пасля 1989 года большасць з іх распалася, а тыя, што пратрывалі, відаць, не вытрымоўваюць канкурэнцыі з прыватным гандлем і маюць клопат з еўрасаюзнымі патрабаваннямі. ГСы былі інкубатарам правінцыйных элітаў, сябры якіх ласкавай рукой дзялілі супольнае дабро. Геэсаўская вярхушка, не пазбаўленая сялянскіх звычак, нярэдка трактавала свае пасады як прыватныя гаспадаркі, злоўжываючы службовай пазіцыяй.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Пекары Уладзімір Багацэвіч (зараз на пенсіі) і Іаланта Амельянюк (цяпер працуе прадаўшчыцай); здымак з 1990-х гадоў

Як працаваў арлянскі ГС калісь і цяпер ведаюць тыя, што былі ягонымі кліентамі. ГС у Орлі трывае, але дзесяць гадоў таму людзі сцвярджалі: „Магло б быць лепш у нашым ГСе, калі б тры гады раней памянялі старшыню. Тады прыватны гандаль не быў яшчэ канкурэнтаздольны і можна было павесці фірму ў іншым напрамку і затрымаць пры сабе кліентаў”.

Калі ж некалькі гадоў таму старшыня падаўся сам на ранейшую пенсію, перад ГСам з’явіўся прывід ліквідацыі. Толькі дзякуючы Назіральнай радзе і наступнаму старшыні ГС стаў дзейнічаць больш напорыста. Але да часу.

У красавіку г.г. па Орлі пайшла сумная вестка, што ГС прадае пякарню запар з адміністрацыйным будынкам. У газетах з’явіліся нават аб’явы, але пакуль няма ахвотных брацца за пякарскую справу. Затое знайшоўся варшавяк, які ахвотна запусціў бы тут іншую вытворчасць, напрыклад, драўнінную.

У колішняй Орлі было некалькі яўрэйскіх пякарняў, якія згарэлі ў вялікім пажары мястэчка ў 1938 годзе. Ацалела толькі мураваная пякарня Іосіфа Ізбуцкага (пры „камуне” ягоная сям’я з Бельска выехала ў Ізраіль), якая пасля вайны стала ўласнасцю мясцовага ГСу і так працавала да канца 1970-х гадоў. З пачатку 1980-х гадоў у Орлі працуе новая пякарня.

Орля здаўна славілася м.інш. высакаякаснымі мяснымі прадуктамі (у 1990-х гадах ГС прадаў мясазавод, які прыватнік перарабіў на кандытарскі, які зараз збанкрутаваў) ды вельмі ўсё смакавітым хлебам (ГС да нядаўна меў таксама свой млын). Якасць арлянскага хлеба і сёння найлепшая, не дакажуць яму ні кляшчэлеўскі, ні беластоцкія хлябы, якія завозяць у Орлю прыватнікі.

І, па сутнасці, гэта за хлебам пакупнікі наведваюць геэсаўскую прадуктовую краму (раней было іх дзве ў цэнтры мясцовасці і адна на акраіне), таму што тут харчовыя прадукты даражэйшыя чым у прыватных; адна геэсаўская прадаўшчыца паціху прызналася мне, што некаторыя прадукты купляе ў канкурэнцыі. Старшыня ГСу Аляксандр Шыманскі тлумачыць мне, што ў кожнай краме цэны тавараў розныя і ў геэсаўскай бываюць таннейшыя.

Калісь арлянскі ГС быў буйной установай: было каля дваццаці крамаў (у самой Орлі 6), быў рэстаран, у якім сілкаваліся рабочыя мясцовых прадпрыемстваў ды нават прыязджалі сюды людзі аж з Бельска, а на яго патрэбы разводзілі нават свіней ва ўласным адкормачным пункце. Быў бар з алкагольнымі напоямі, напоўнены тлумам гурманаў, якіх вечарам цяжка было вытурыць за дзверы, каб закрыць установу. Былі два пункты скупкі жывёлы — у Вульцы-Выгаеўскай і Орлі (цяпер у прыватных руках і дзейнічае толькі ў Орлі, куды ўласнік сам звозіць жывёлу, купляючы яе ў сялян). Быў склад збожжа, угнаенняў і апалу, была паслуговая майстэрня, была цырульня і „практычная пані”, была бойня і каўбасны завод, была пякарня з уласным токагенератарам на выпадак аварыі.

Зараз маёмасць ГСу складаюць дзесяць магазінаў, з іх ліку восем у вёсках, адзін універмаг у Орлі, у які аб’ядналі тры крамы (тавары хатняга ўжытку, металічныя вырабы і адзенне); раней працавалі ў іх дзесяць прадаўшчыц, а цяпер дастаткова дзвюх (дзякуючы іх намаганням тавару крыху больш). І згаданая прадуктовая крама. Некалькі гадоў таму ГС папрадаваў усе свае складскія будынкі ды краму ў пачатку мясцовасці. У цэнтры Орлі пустуюць два будынкі, дзе раней былі крамы — прадуктовая (у колішняй пякарні) ды вялікі, дзе былі тавары хатняга ўжытку. Але як прызнаецца сам старшыня, ГС не хоча іх прадаваць ахвотным, каб не вырасла чарговая канкурэнцыя. Цяпер прадуктовая крама ГСу спаборнічае з трыма прыватнымі.

Хаця ў Орлі жыхароў нямнога і мала хто сюды прыязджае, аднак кожная крама мае сваіх кліентаў. Найбольшым поспехам карыстаецца прыватны магазін у колішнім пастарунку міліцыі. Прыватная крама лепш прэзентуецца, уладальнік не пашкадаваў грошай на рамонт (якога вельмі патрабуе геэсаўская крама), тут большы выбар тавараў і даступнейшыя цэны.

Пацікавіўся я, як выглядае справа ў вёсках. Некаторыя вяскоўцы наракаюць на геэсаўскія магазіны, што прадаўшчыцы ў іх не дбаюць пра размаітасць тавараў і тыя крамы часта закрыты. Але прадаўшчыцы не маюць матывацыі, бо зарабляюць не ад утаргоўкі, бо ад гэтага не ўдаецца дасягнуць нават мінімальнай зарплаты (прадаецца замала тавару), а такую — воляй-няволяй, згодна закону — і так мусяць атрымаць. Многія трывожацца, што можа не быць хлеба з геэсаўскай пякарні. Бо ён добры, смачны. Найбольш купляюць яго ў Орлі, куды яшчэ не прабіліся аўтакрамы. Людзі наракаюць на старшыню.

Людзям не дагодзіш, кажа старшыня арлянскага ГСу Аляксандр Шыманскі, але так ёсць, што старыя звычкі, каб падшчыпнуць, моцна трымаюцца. А прыватнаму гандлю лягчэй, ён не абцяжараны бюракратыяй, уласнік займаецца кнігаводствам дома, ды і прадаўшчыцы больш дысцыплінаваныя і зацікаўленыя даходнасцю.

— Усё нам псуюць аўтакрамы, — кажа старшыня, — якіх з рознымі таварамі праязджае ў дзень нават па шэсць. Яны не задавальняюць санітарных патрабаванняў, але людзі купляюць, бо машыны заязджаюць нават у двор. Я звяртаў увагу санэпідэмстанцыі, але там мне адказалі, што „кожны хоча жыць”. ГС сам стаў развозіць хлеб, прадаючы яго нават на 10 грошаў танней чым у краме, але і гэта не памагае. (Нядаўна ў Крывятычах удалося шафёру прадаць толькі 6 хлябоў — М. М.)

— Я не лез на пасаду, — тлумачыць. — Калі тры гады таму адышоў на пенсію тадышні старшыня, ГС меў каля 150 тысяч урону. Тады новая Назіральная рада, у большасці з жанчын, запрапанавала, каб я пакіраваў кааператывам. Згадзіўся я толькі на тры месяцы, але так астаўся. Урон звёў я да нуля, але дабіваюць нас высокія гмінныя падаткі (цяпер каля 15 тысяч за пякарню). Зараз пякарня не дае грашовага прыбытку. Падае продаж па вёсках з-за аўтакрамаў. Будынак пякарні патрабуе капітальнага рамонту: папраўкі даху, замены акон ды, самае важнае, замены вугальнай печы. Да таго ж еўрасаюзныя нормы патрабуюць пакласці ўсюды пліткі (цяпер сцены маляваныя фарбай). Праца старшыні нервовая, адказная, выклікаючая стрэс. Бяру толькі 800 злотаў. Можа яшчэ з год пабуду.

— А што з будучынёй ГСу? Калі будзе пякарня, то ГСу не быць. Калі не будзе пякарні (калі б удалося яе прадаць — цана каля 60 тысяч злотаў — скончыліся б падаткі), тады ГС будзе існаваць, — сумна падсумоўвае ягоны старшыня Аляксандр Шыманскі.

У выпадку ліквідацыі пякарні, пекары і іх загадчыца перайшлі б на працу ў магазіны. Працу страціць двух шафёраў (іх машыны ўстарэлыя), астанецца толькі адзін. Бюро пяройдзе на паддашак рэстарана (раней быў там цырульнік), які шмат гадоў арандуе прыватнік (прадае алкагольныя напоі, а ў кухонным адсеку газіруе ваду з арлянскага водаправода).

Старшыня плануе аднавіць фарбай заржавелы дах рэстарана, будынку Бэрка, яшчэ яўрэйскага (людзі кажуць, што гэтага запатрабавала санэпідэмстанцыя), ды франтоны прадуктовага магазіна і фасад універмага. Жыхары Орлі ў размове са мной сцвярджалі, што за продажам пякарні наступіць і скоры канец самому ГСу.

Гандлёвыя геэсаўскія будынкі знаходзяцца ў самым цэнтры Орлі, у г.зв. рынку. Яны ў большасці старыя, а іх выгляд наводзіць сум. Мяркую, што пасля ўпадку ГСу (а на гэта збіраецца), калі яны трапяць у прыватныя рукі, наступіць новы перыяд, калі паправіцца выгляд гэтай візіткі Орлі ды яе ажыўленне.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Мерапрыемства з нагоды 62-ой гадавіны Перамогі

У сувязі з адзначэннем 62-ой гадавіны Перамогі, Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, а таксама консульскія ўстановы Беларусі актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай даце.

7 мая адбылася сустрэча ў Саюзе ветэранаў Польшчы і Канвенце польска-расійска-беларускага паразумення, прысвечаная 62-ой гадавіне Перамогі. У сустрэчы прынялі ўдзел супрацоўнікі пасольстваў Беларусі і Расіі, ветэраны Войска Польскага, дэлегацыя Маскоўскага гарадскога камітэта ветэранаў, прадстаўнікі грамадскасці. Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, кіраўнік Саюза ветэранаў Польшчы Вацлаў Шклярскі, а таксама старшыня Канвента польска-расійска-беларускага паразумення Мар’ян Вальчак звярнуліся да прысутных з віншаваннямі з нагоды свята.

8 мая ў Варшаве прайшло ўрачыстае ўскладанне кветак да Магілы невядомага салдата. На ім прысутнічалі прадстаўнікі польскіх улад, нацыянальных узброеных сіл, дыпламатычнага корпуса, грамадскіх аб’яднанняў Саюз ветэранаў Войска Польскага і „Польшча-Усход”. Ад імя Пасольства Беларусі да помніка быў ускладзены вянок.

У гэты ж дзень адбылася сустрэча актывістаў польскіх аб’яднанняў ветэранаў вайны, удзельнікаў вызвалення Беларусі, Польшчы, іншых краін Еўропы, з удзелам беларускіх і расійскіх дыпламатаў. Дыпламаты выказалі ветэранам удзячнасць за іх уклад у Перамогу. Пасля сустрэчы адбыўся канцэрт з удзелам польскіх артыстаў.

9 мая з нагоды 62-ой гадавіны заканчэння Вялікай Айчыннай вайны з удзелам кіраўнікоў дыпламатычных місій Расіі, Беларусі, Украіны, Казахстана, Малдовы і іншых краін СНД адбылося ўскладанне вянкоў да Мемарыяла савецкім салдатам, загінуўшым пры вызваленні Варшавы.

Прэс-служба Пасольства РБ

Новыя дошкі аб’яў

Сёлетняй вясной у шматлікіх вёсках Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет) паставілі новыя дошкі аб’яў, між іншым, на афішы і плакаты. Зараз стаяць яны ў Нараўцы па вул. Міцкевіча, у Старым Ляўкове ля святліцы і крамы ГС, у Новым Ляўкове побач пункту скупкі малака, у Міклашэве, Новым Масеве, Стачку, Свінароях, Заблотчыне і ў Янове.

— Дзе толькі будзе трэба іх паставіць, там зараз жа давязем, — кажа войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

Пра новыя т.зв. табліцы аб’яў паклапаціўся спадар войт. Вялікае дзякуй яму за гэта.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

„У клетцы” — Віктар Швед

У хатах з бярвенняў
Лясных, смаляных
Жылі пакаленні
Ў стагоддзях былых.

А ў век наш дваццаты
Спяшаемся мы
З драўлянае хаты —
У гмахі-дамы.

І птушка з балкона
Глядзіць, як на здзек:
У клетцы з бетону
Жыве чалавек.

У школьнай святліцы Комплексу інтэграцыйных школ № 1 імя Яна Паўла II у Беластоку 19 красавіка 2007 года адбылася аўтарская сустрэча спалучаная з дэкламатарскім конкурсам паэзіі Віктара Шведа. Гэта ўжо амаль дзесяць гадоў як гасцюем у сябе паэта, журналіста, перакладчыка, спадара Віктара Шведа.

У сваёй паэзіі вандруе ён да крыніц і каранёў, да месца свайго дзяцінства, да дрэў, кветак, птушак і прадметаў, якія неадлучна спадарожнічалі яму ў доўгай вандроўцы праз жыццё.

У сваім апошнім паэтычным зборніку паўстае ён перад намі як нястомны вандроўнік, які па волі лёсу стае бездапаможна перад рэчаіснасцю. Свет, які ён бачыць з-за акна, гэта не той самы свет, які бачыў будучы малым дзіцём. Узрастаў ён сярод хараства прыроды, якая сёння так часта знішчаецца маладым пакаленнем. У ягоных першых паэтычных зборніках можна проста насычацца прыгажосцю прыроды. Якім жа цудоўным быў бы свет, калі б мы ўмелі жыць у суладдзі з натурай і заўважаць прыгажосць свету. Вершы Віктара Шведа запрашаюць нас у духмяныя квітнеючыя сады, у родны дом з агнём у каміне.

Nadszedł nareszcie wytęskniony,
Uwielbiany czas radosny.
Oto zawitała do nas
Uśmiechnięta, strojna wiosna
Wokół sieje wonne kwiaty,
Ptakom każe pięknie śpiewać,
Wdziewa kolorowe szaty
Nagusieńkim całkiem drzewom.

Wychłodzoną ziemię słonko
Osuszyło i wygrzało,
Zwiastowaniem swym skowronki
Wyśpiewują wiośnie chwałę.

Wiosnę sławią też poeci
W swoich ulubionych wierszach,
Zachwycają się nią dzieci,
Ślą jej uczuć moc najszczerszych.

(„Wiosna”)

Варта падацца ў такую вандроўку, адчуць пах траў, пачуць птушыны спеў, якога штодзень не чуем, бо ніхто нас гэтаму не навучыў. Бяжым праз жыццё так хутка, што многае можам прапусціць. Аб тым, што варта прыпыніцца на хвіліну і ўслухацца ў голас прыроды, адчуць гордасць, прыемнасць, а нават шчасце з-за таго, што вось умеем убачыць больш чым толькі замкнутае кола штодзённых абавязкаў і хатніх заняткаў — аб усім гэтым напамінае нам Віктар Швед. Я шчыра заахвочваю чытаць такую паэзію. Давайце вучыцца з яго простых, цёплых, поўных любові да чалавека і прыроды вершаў, што супрацоўніцтва больш вартаснае чым саперніцтва, што жыццё так хутка мінае.

Калі ўсё жыццё перамолата,
Калі ўсе хвіліны растрачаны
Ты часу не купіш за золата,
Не атрымаеш у спадчыну.

Жыццё на зямлі ў нас адзінае,
Жыць трэба разумна,
напружана.
Увогуле, кожнай хвілінаю
Больш даражыць, чым
жамчу жынай.

(„Час”)

Вяслава СМАЛЬКОЎСКІ
— каардынатар святліцы КІШ № 1 у Беластоку

Белавежскія расказы

Лясны доктар

Стаміўся за зіму дзяцел — цяжка ў мароз і холад лячыць дрэвы. Ды і шкоднікі хаваюцца глыбей пад кару, зашываюцца пад ігліцу, залазяць у розныя адтуліны. Выцягнуць іх са сховішчаў складана. Але маленькая спрытная птушачка, з дапамогай сваёй дзюбы ў выглядзе долата, і доўгага тонкага клейкага язычка дастае з самых неверагодных схронаў усю гэтую пачвару, якая не дае дрэву дыхаць.

Наш маленькі стракаты дзятлік, якога дзеці назвалі Хірургам, пастаянна абслугоўваў адзін і той жа ўчастак лесу, каля дарогі, якая вядзе ў Белавежскую пушчу. І так да яго барабаннага пошчаку прывыклі, што кожную раніцу дарослыя, ідучы на работу, і дзеці ў школу, міжволі прыпыняліся і шукалі поглядам: дзе наш лясны доктар? А ён сабе не звяртаў на нікога ўвагі, стукаў і стукаў па хворых дрэвах, выцягваючы з-пад кары паразітаў. Ды і здаровым рабіў рэгулярна прафілактыку: праслухоўваў іх лёгкія, заглядваў пад кару, прастукваў дзюбай-малаточкам сосны ад нізу да вершаліны. І пушчанскія волаты-дрэвы былі яму вельмі ўдзячны за своечасовае лячэнне.

Аднак не ўсе лічылі дзятла сваім збавіцелем. Вельмі ганарлівыя елкі не надта прыязна сустракалі пярнатых дактароў: натапырвалі свае іголкі, закрываліся галінамі-лапамі пры выглядзе „доктара”. Навошта нас трывожыць, мы і так здаровыя і прыгожыя. Вунь як нас любяць хлопчыкі і дзяўчынкі: пад Новы год і Каляды ўпрыгожваюць цацкамі, пяюць пра нас песні, водзяць карагоды. Не мог наш дзятлік-хірург пераканаць іх у карысці своечасовага лячэння, як не могуць іншы раз бацькі прымусіць сваіх дзетак схадзіць да зубнога ўрача, аж пакуль зубы не пачнуць балець.

Дык вось, прайшоў нейкі час і сталі непаслухмяныя елкі памалу жаўцець, абсыпаць іголкі, якіх раней ніколі не скідвалі, пачала аблятаць з іх кара. Кінуліся тады старыя дрэвы да смелага доктара: дапамажы, не пакінь нас у бядзе! На тое дзяцел і доктар, каб лячыць кожнага, хто захварэе, і не крыўдаваць за іх неразуменне. Хуценька сабраў Хірург свой інструмент, навастрыў дзюбу-долата, змазаў клейкім рэчывам язык і пераляцеў на ельнік.

Тое, што ён там убачыў, выклікала ў яго вялікую трывогу: столькі развялося караеда-шкодніка ў яловым лесе — немагчыма аднаму ўправіцца. Стаў наш сябра клікаць на дапамогу другіх птушак-санітараў, разам яны дружна ўзяліся за работу. Зранку да вечара стукалі па дрэвах, даставалі лічынак і чарвячкоў, працавалі ўсю вясну і лета, яшчэ і на восень-зіму хапіла работы. Не ўсе дрэвы ўдалося ўратаваць Хірургу, некаторым немагчыма ўжо было дапамагчы. Але выратавалі шмат елак у пушчы. Удзячныя дрэвы цяпер радасна вітаюць свайго збавіцеля, і не закрываюцца больш ад яго разлапістымі галінамі-рукамі.

А наш маленькі доктар зноў вярнуўся на сваю тэрыторыю ля дарогі і прывітаў нас у пачатку новай вясны гучным „др-р-р-р-р...” А ўчора, ідучы па вясковай вуліцы, я раптам пачула барабанны стук на даху аднаго з дамоў. Што гэта за музыкант, падумала я, уздымаючы галаву ўгору. І нечакана ўбачыла даўняга знаёмага. Ён адхіляў на даху кавалак бляхі і слухаў, як яна дрынчыць на ўсю ваколіцу. Гэтым сваім музычным інструментам ён скарыстаўся, мабыць, для таго, каб выказаць людзям сваю перасцярогу: беражыце дрэвы і лес ад усялякай напасці — яны наш агульны дом і ратунак, жытло і чыстае паветра.

Таіса СКУРАТАВА
вёска Камянюкі

ЗАГАДКІ

З чалавекам ён сябруе,
Ноччу двор яго вартуе,
Служыць шчыра небарака,
Хоць і кажуць: „Злы...”

(Сабака)

Ці то ў будні, ці то ў святы —
Носіць свой кажух багаты.
А яна ж яго не шыла
І за грошы не купіла.

(Авечка)

Чатыры хадуны —
Каб чабаткі таптаць.
Чатыры цвыркуны —
Каб дзецям радасць даць,
А вілы прад сабой —
Усім звярам на страх,
А ззаду — мухабой:
Хлясь — мах!
Хлясь — мах!
Хлясь — мах!

(Карова)

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 30 —

У апошні тыдзень красавіка я лічыла дні да пятніцы. У гэты дзень пачынаўся доўгі уік-энд. Мае сяброўкі таксама не маглі дачакацца вольных дзён. Мы дамовіліся, што будзем катацца на веласіпедах, хадзіць у парк, на пакупкі і вучыцца ездзіць на скейце.

У першы вольны дзень мы з Касяй і Соняй паехалі да Ганкі. Вечарам мы пайшлі на рок-канцэрт. Калі мы вярнуліся да нашай сяброўкі, яе бацькі ўжо спалі. Нам было вельмі цяжка паводзіць сябе належным чынам, значыць, быць ціха, паколькі вельмі хацелася пасмяяцца. Тым больш што ў мяне і ў дзяўчат неўтаймаванае пачуццё гумару — мы можам смяяцца з усяго, нават калі няма з чаго...

Нягледзячы на позні час нашага вяртання да Ганкі, мы пайшлі спаць толькі ў пяць гадзін раніцы...

У наступныя дні было вельмі брыдкае надвор'е. Я паехала да бабулі ў вёску.

Дзяўчаты таксама паехалі да сваякоў, тым больш, што ў нашым горадзе нічога цікавага не дзеялася. Першыя выхадныя дні цягнуліся як бразільскія тэлесерыялы.

У сераду, разам са мной, у Беласток вярнулася вясна. Я адразу дамовілася з дзяўчатамі паездзіць на ровары. У час веласіпеднай экскурсіі па горадзе мы сустрэлі многа знаёмых: нашу выхавацельку Аўрэлію з мужам і сябру Ігара, які сёння памяняў скейт на ровар. Мы дамовіліся на суботу. Наш сябра меў навучыць нас ездзіць на скейце. Папраўдзе я не магла дачакацца гэтага дня і таму, каб прыспешыць час, мы з мамай пайшлі на вялікія пакупкі: я купіла спадніччку „міні" і туфлікі „балерынкі", кашульку ў гарошкі, якая цяпер вельмі модная. Мой бацька традыцыйна панаракаў. Ён дакараў мяне за тое, што я растраціла ўсе грошы, якія дала мне бабуля. Аднак прызнаўся, што рэчы, якія мы купілі — прыгожыя.

Кася і Соня не хацелі вучыцца ездзіць на скейце, таму ў суботу на сустрэчу з Ігарам я пайшла з Ганкай. Апрача нашага сябры, ля тэатра, дзе звычайна сустракаюцца ўсе скейты горада, былі таксама хлопцы, якіх мы сустрэлі тыдзень раней на беларускім рок-канцэрце. Гэта былі „Шчупак", Мар'ян і ўнучак спадарыні Воўк.

— Я, здаецца, ведаю тваіх сяброўак, — сказаў Мар'ян. — Ці яны не былі на прэзентацыі нашага фільма?

— Былі-былі, — адказаў Ігар. — Я нават вас з імі пазнаёміў. Але я памятаю іх яшчэ з нейкага рок-канцэрта.

Якраз тады, калі мы танчылі *пога* з яго сябрамі, Ігар астаўся дома. І цяпер ён не ведаў што сказаць:

— Тады пазнаёмцеся яшчэ раз, — прапанаваў ён.

Мы яшчэ раз пазнаёміліся. Цікава на як доўга? Але самае важнае тое, што ў гэты дзень мы пачалі ездзіць на скейце. Хлопцы ахвотна сталі нашымі інструктарамі. „Шчупак" вучыў Ганку, мяне — Мар'ян. Першы ўрок быў проста камічны. Ужо ў час першай спробы мы грымнуліся шмат разоў аб голы бетон, пабілі локці і калені, набылі многа сінякоў... Аднак ніхто са скейтаў не звяртаў увагі на такую дробязь. Раны і кроў — для іх частка гульні ў ідэалогіі. Гэтыя ўсе пакуты канчаткова мелі давесці нас да... дасканаласці.

Мы зразумелі, што гэты спорт не надта цікавы для дзяўчат, але першы ўрок трэба было дацягнуць да канца.

Тэкст <natasza9922@wp.pl>
Дызайн <lolcia05@wp.pl>

Добры дзень „Зорка"!

Неўзабаве ўсе будзем адзначаць Свята Мамы. З гэтай нагоды я напісала два вершы, якія прысвячаю сваёй маме.

Нашы мамы

Нашы мамы як спакойнае мора.
З імі не адчуем ні бяды, ні гора.
Яны як родны порт, куды
Вяртаюцца ўсе караблі.

Мамы як скарбніца ведаў,
У іх словы далікатнейшыя чым у паэтаў.
Мы для іх заўсёды нумар першы.
Нашага кахання не выкажуць ніякія вершы.

Мама

Мама, я цябе ў сэрцы хаваю,
Вельмі шчыра цябе кахаю.
Мне ніколі шчасця не трэба было шукаць,
За тваю дабрыню я хачу дабром адказаць.
Дзякую, мама, за тваю навуку,
За ў нядолі працягнутую руку.
Ты мне заўсёды паўтарала,
Каб я ўсім людзям крыўды выбачала.

Я буду твае навукі шанаваць,
Усё жыццё вельмі цябе кахаць.
Я ніколі твае дабрыні не забуду,
Тваю прыгожую ўсмешку памятаць буду.

Ася ТРУСЭВІЧ,
вучаніца III класа Гімназіі ў Нараўцы

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Дамініка Юшкевіч (Нарва)

Пётр Аўксянцюк (Гайнаўка)

Польска-беларуская крыжаванка № 20



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 16: Зуб, зара, малы, ар, парус, ды, парэчка, баран, ха, адвага. Зубр, пах, хмара, арэна, луг, зыск, ага, рад, карытка.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Патрыцыя Якубюк** з Нарвы, **Марыёля Анішчук, Рафал Скепка, Ася Стоцкая** з Дубін, **Караліна Рашкоўская** з Бабік, **Мажэна Дмітрук, Наталля Янцэвіч** з Чыжоў. Віншуем!

Пра Чарнобыль у ТБК Літвы

Вясна. Першая зеляніна, кветкі, галасы птушак, лёгкі ветрык. Усё гэта так цешыць вочы, хочацца як найбольш і найдаўжэй знаходзіцца сярод такога хараства, быць у ім, датыкацца, на поўню насычацца ласкамі прыроды. Так як і сёння, так заўсёды і 20 год таму ўзнікалі такія пачуцці. На вялікі жаль, тады ніхто не папярэдзіў людзей, што гэтага рабіць не трэба. Першым хто паведаміў пра выбух на Чарнобыльскай атамнай станцыі была ўкраінская рэдакцыя „Голасу Амерыкі". Але жыхары тых раёнаў, якія знаходзіліся даволі блізка да месца выбуху, не ўспрымалі ўсур'ёз такой навіны, бо не ўсе мелі магчымасць слухаць „Голас Амерыкі", а ўлады замоўчвалі і настройвалі так, што нібы нічога не адбылося.

Але ў хуткім часе ўзніклі праблемы з жывёламі і птушкамі — нешта нязвыкла і дзіўна яны сябе паводзілі, а праз тыдзень пачалі паміраць немаўляты. Вялікая колькасць радыяцыі асела ў бліжэйшых лясах у радыусе 10-15 кіламетраў. Загадана было спаліць шмат гектараў лясоў. Не памагло — радыяцыя разам з дымам перамясцілася на досыць вялікія адлегласці. Нават у такім горадзе як Маладзечна (ён знаходзіцца прыкладна ў 100 км ад Вільні) у той час быў зафіксаваны такі ж высокі радыяцыйны фон як і ў блізкіх да ачага раёнах. Там пабудавалі вялікую спартыўную школу, у якой дзеці часта падалі і трацілі прытомнасць. Відаць, не ведалі, што пры вялікай радыяцыі фізічнымі практыкаваннямі займацца нельга. З пачатку 90-х гадоў жыхары пачалі пераязджаць у больш чыстыя раёны, але многія з іх ужо мелі сур'ёзныя праблемы са здароўем і не маглі прыстасавацца да новых умоў. З таго часу шмат вёсак вымерла ды, каб месца не было пустым, улады засяляюць гэтыя тэрыторыі іншамоўным насельніцтвам.

Ад радыяцыі там усё незвычайна расце, чаго не было да аварыі. Тыя, хто жыве на тых абшарах, з'яўляюцца аб'ектамі вопытаў. Над імі негалосна праводзяцца эксперыментальныя даследаванні.

Пра ўсё гэтае 28 красавіка распавёў на імпрэзе Таварыства беларускай культуры, прысвечанай Чарнобыльскай аварыі, журналіст Андрусь Старавойтаў, які сам у той час быў сведкам гэтых падзей.

У зале панаваў адпаведны настрой, які перадавала аздабленне залы: на ярка-зялёным фоне, так блізкім да веснавой зеляніны, раскіданы рознакаляровыя кветкі — сярод якіх некалькі чорных (мастачка Крыстына Балаховіч).

У другой частцы імпрэзы, прысвечанай паэтычнай творчасці сяброў ТБК, прысутныя пазнаёміліся з творамі Веры Хамянюк. Аўтарка прачытала яшчэ нідзе не друкаваныя вершы, у тым ліку і пра Чарнобыль. Дарэчы, ТБК працуе над праектам выдання кнігі твораў сяброў ТБК.

Як заўсёды, змястоўна і цікава выступіў журналіст Алесь Адамковіч. Ён расказаў пра святара Ільдэфонса Бобіча, які ў 20-я гады працаваў у Кафедральным касцёле ў Вільні, а службу праводзіў па-беларуску. Але, на жаль, уладам гэта не падабалася і доўга працаваць яму не далі.

Старшыня Таварыства беларускай мовы Юрый Гіль прадэкламаваў некалькі сваіх вершаў. Такім чынам у Літве ўшанавана памяць пра Чарнобыль.

К. БАРСУЧОК

Лёс чалавека, Гарадок

Не першы раз завітаў на Гарадоччыну рэжысёр Уладзімір Бокун са сваёй камандай з мінскага тэлеканала «Лад». Прывозіў ён ужо дакументальны фільм пра гурт «Прымакі», дзе было не толькі пра музычную дружыну Астапчукоў і іх сяброў. Прамільгнулі тады краявіды Гарадоччыны, постаць айца Мікалая, сонечны каляровы свет старэнькай Надзі Дудзік сярод разбуялых ліпеньскіх кветак яе агарода, працавіты дзень Уладзіміра Лукашыка, гучны дзень нараджэння старажытнага Гарадка... На тадышні паказ у страшэнную галалёдзіцу тады сабралася поўная глядзельная зала гарадоцкага Дома культуры імя Кастуся Каліноўскага.

Уладзімір Бокун, злева Аляксандр Суцкавер

У гэты раз Уладзімір Бокун прывёз тры фільмы і... доўгачаканы дождж, ды гэта па спецыяльным заказе спадарыні Міркі Антановіч, у якой доме заўжды спыняецца здымачная каманда рэжысёра, і дзе начуюць таксама такія гурты як «Н.Р.М.» ці «Нейра Дзюбель». І ў дзень Юрыяў, Аляксандраў ды Анатоляў (што было адзначана асабліва ўрачыста), пад дробны дождж ды моцны вецер сышоўся тлум. У большасці з Гарадка, бо з Меляшкоў, пра якія таксама быў фільм, змог дабрацца толькі адзін з герояў кінакарціны Аляксей Карповіч. Прывёз яго сын Янка, вядомы дзеяч культуры, папулярна званы «Калакольчыкам» ад свае ўлюбёнай песні. А для галоўнага героя і госця, айца Мікалая Астапчука сустрэча была нагодай таксама для пару прамоў на роднай мове да свае маладой (ён жа

Айцец Мікалай Астапчук

апякун праваслаўнага моладзевага брацтва) і старэйшай паствы, вельмі патрыятычных і жыццёвых...

Два фільмы — «Айцец Мікалай» і «Вёска на мяжы» — ужо вядомыя ў Беларусі. Выклікалі яны вялікі розгалас у краіне, паколькі паказвалі шмат невядомага сярэдняму беларусу. Асабліва карціна пра нашых беларусаў, мо і не самых Карповічаў, бо галоўны герой не Янка, нават і не 85-гадовы Аляксей, ягоны бацька, нават і не старажытнейшыя за Гарадок Меляшкі, а беларусы, тутэйшыя, укаранёныя ў сваю зямлю, якіх не па іхняй волі гісторыя ганяла па свеце, кроіла яе крывавым лязом як заманілася палітыцы, прымушала насіць чужыя пашпарты нават тады, калі крокам не рушыліся са свайго месца. Аляксей Карповіч не па сваёй віне быў у палоне ў фашыстаў, пасля трапіў у савецкі лагер за тое, што быў палонным у немцаў, адрабіў здароўе ў Сібіры, пасля не мог вярнуцца дахаты з Беларусі. Не дачакалася ягонага вяртання дахаты матуля Юля. Толькі брат Барыс, у форме даехаўшы і ў Маскву, не ў адны дзверы настукаўшыся, забраў у Меляшкі свайго брата ўжо з беларускай сям'ёй. Усюды Аляксей працаваў шчыра, майстар на ўсе рукі, дакладваў сваю цаглінку і не да сваёй справы, усё трымаючыся роднага. І цяпер ён не ў адзіноце, спявае разам з іншымі народнымі харыстамі. І сын ягоны Янка, які нарадзіўся ў Беларусі, і ягоная сям'я тут заўжды з родным словам і песняй. А як тая несправядлівая гісторыя адціснулася на ментальнасці людзей, можа сведчыць факт «жарту» дырэктара ГДК, які назваў Янку Карповіча «навалаччу», бо... нетутэйшы ён, прыехаўшы. «Я адсюль, адсюль мае дзяды і прадзеды», — з гонарам і зразумелай крыўдай адказаў Янка Карповіч. На фільме коратка ды наглядна паказаны былі дакументальныя гістарычныя здымкі і рухомыя карты, дзе можна было ўвачавідкі пабачыць тую дзейнасць гісторыі-мачахі; некаторыя гледачы ў Беларусі шмат чаго не ўяўлялі — таму і такі водгук быў у краіне: паказаны былі звычайныя людзі, зусім не «героі», якія спакойным голасам расказвалі пра горкія справы і сваё звычайнае несалодкае быццё на роднай Беласточчыне. І пра радасць смакавання роднага слова і роднай песні. І Янка «Калакольчык» — тут як той звычайны званочак, былінка, якая вырасце нават у неспрыяльным асяроддзі, невялічкая ды з моцным коранем, што дастане жыватворную ваду нават з немалой глыбіні глебы, званочак, які цешыць кожнае вока сваёй сціплай прыгажосцю. Янка Карповіч здавён працуе на роднай ніве, быў ён музыкам вядомым па ўсіх вёсках Беласточчыны і не толькі, дырэктарам дома культуры, музычным інструктарам. Няма такога мерапрыемства, дзе няма яго з гітарай ды вянком гарадоцкіх спевакоў. Падзякаваў яму і цяперашні дырэктар дома культуры Юрка Астапчук за вялікую падмогу ў сваёй працы.

Дзякаваў дырэктар ГДК і свайму айцу Мікалю Астапчуку ад сябе і іншых членаў праваслаўнай гарадоцкай супольнасці. Фільм пра бацюшку Мікалая (ён лічыў запісы звычайнай размовай пра звычайнае жыццё і ягоныя цуды) выклікаў таксама вялікае зацікаўленне ў Беларусі, дзе пабачылі і пачулі праваслаўнага святара-беларуса, бацьку, мужа. У паказах фільмаў Бокуна (таксама і ягоных калег, а іх каля 30 асоб, м.інш. кінематаграфісткі Зоя Катовіч, Таццяна Пінчук, Алёна Жук, Ларыса Кабернік) мае таксама вялікае значэнне постаць вядучага — Аляксандра Суцкавера, акцёра. У ягоным голасе няма няшчырасці, штучнасці (дарэчы, валодае ён дасканала беларускай мовай). Паставілі яны больш за 80 фільмаў пра «Лёс чалавека». Паказалі яшчэ ў Гарадку фільм «Ваха» — гэта была сусветная прэм'ера! — пра жыхара Беларусі, украінца, Уладзіміра Дацуна, які трапіў на 20 гадоў у няволю

Янка «Калакольчык»

ў чачэнцаў, дзе прадаваўся як раб (памог яму ўцячы на радзіму брат прэзідэнта). Аж неверагоднае можа трапіцца ў жыцці кожнага чалавека. На аснове кожнага жыцця можна паставіць фільм, як заўважыў рэжысёр Уладзімір Бокун. Там той чалавек скажа пра важныя справы. «Падзелішся парадай — лягчэй стане!» — разважаў айцец Мікалай і заахвочваў да веры, таксама і ў сябе.

Калі пра тую веру ў сябе і пачуццё пашаны гаворым, Янка Карповіч сказаў праўду: такія фільмы, такія выступы шмат даюць гэтым звычайным героям, пражыўшым сваё жыццё, бывае, што не зусім сваімі сярод сваіх. Часта яны лічацца дзівакамі, паколькі маюць сваю думку і яе трымаюцца. А і не кожны мае час паслухаць іншага, і падумаць пра агульнае і асобнае. Трэба часу на рэфлексію. І на такі момант, каб сышліся ўсе разам, паслухалі песню, пабачылі, як іншыя нас бачаць.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Духовыя разлады

Частка „Гарадзенскай капэлы" пасля канцэрта ў Варшаве

Нашы ўяўленні правяраюцца жыццём. Бывае так, што не спадзяемся, а часта нават і не хацелася б нам ведаць больш за тое, што здаецца нам верагодным, сапраўдным і натуральным.

Шмат гадоў, можа пад дваццаць, наглядаю што і як адбываецца ў час Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі, большасць жыцця ў Гайнаўцы, а цяпер, пасля ўзнікнення там другога фестывалю, сачу таксама за ходам фестывалю, перанесенага ў Беласток дзякуючы рашучасці ягонага дырэктара і стваральніка ў адной асобе — Міколы Бушко. Не цікавяць мяне занадта прычыны раздзелу фестываляў, ход канфлікту, аднак трэба ясна сказаць, што ў выніку найбольш пацярпелі музыка ды слухачы. Многа патраціла і сама Гайнаўка, дзе праходзіў прэстыжны фестываль нулявога класа. Цяпер зноў, здаецца, схіляецца яна да ролі месца, дзе праезджыя спыняюцца на пакупкі ў адным з супермаркетаў.

Фестывальныя хоры ў Беластоку часта пытаюцца пра канцэрты ў цэрквах, частка прыезджых дзівіцца, што конкурс увогуле праводзіцца ў філармоніі. Апекунам хораў часта нават не хочацца тлумачыць чаму сітуацыя ў нас такая, а не іншая, няраз проста становіцца ім сорамна. Мне тым болей цяжка, бо ведаю адчуванні, калі чакаецца сігналу дырыжора, стоячы перад царкоўным алтаром. Шмат гадоў я ўжо не спяваю ў хорах, затое час ад часу дапамагаю ім арганізацыйна. Перш за ўсё гэта шанс пазнаць людзей і ўсходнюю перспектыву, бо найчасцей займаюся рускамоўнымі групамі. У гэтым годзе я мела магчымасць пазнаёміцца з хорамі з Азова ў Расіі ды Гродна. Дзве прафесійныя групы, а як жа іншы падыход да музыкі, спеву, жыцця...

Ансамбль „Благовест" з Азова гэта група людзей, якія проста займаюцца спевам. Выступаюць яны на эстрадзе без інструментаў, але і ў сваёй парафіі кожную нядзелю спяваюць у час набажэнстваў, а між імі зарабляюць грошы, спяваючы ў рэстаранах ды выступаючы на гастролях, бывае што і на прафесійных ды камерцыйных фестывалях. Аднак любяць яны сваю працу, амаль беспраблемна спалучаюць духовую місію і камерцыйны бок жыцця. Свядомасць цяжкасцей, але і ахвота ісці ўперад усё ж такі даюць ім энергіі і духовых сіл.

З другога боку „Гарадзенская капэла" — дзяржаўная ўстанова культуры. Гэта частка культурнага прадпрыемства, у рамках якога супольна існуюць капэла, ансамбль і аркестр. Капэла гэта прафесійны хор. Спевакі рэпеціруюць чатыры разы ў тыдзень, за што атрымоўваюць невялікую заплату. Каб нармальна жыць, працуюць яны на штатах у школах ды вышэйшых установах, вядуць урокі па музыцы, даюць лекцыі. Частка гэтых прафесіяналаў набывала вопыт за межамі, у Польшчы, Германіі. Цяжка нават рассудзіць ці гэта прынесла больш карысці ці страты, бо з размоваў вынікала, што смак Захаду хутчэй даводзіць да ўнутраных разладаў. Здавалася, нават у звычайным кантакце, што тыя, якія не прабавалі працаваць за мяжой, якія ў пэўным сэнсе не спазналі на практыцы дэмакратычнай сістэмы, былі больш шчаслівымі. Але гэта хіба нармальнае, калі не маеш, або і не шукаеш альтэрнатывы, калі пазбягаеш цяжкіх выбараў. З другога боку, у выказваннях яны не вельмі ганарыліся сваёй радзімай, нават пра свае адносіны да яе не хацелі занадта расказваць, не гаворачы пра беларускую мову, бо яна ім амаль замежная. Мне не перашкаджае, калі на беларускія пытанні адказваюць мне па-руску ці нават па-польску, але чаму ў ліку трыццаці асоб была толькі адна асоба, якая свабодна размаўляла па-беларуску і быў гэта чалавек, які некалькі гадоў працаваў на тэрыторыі сённяшняга Гайнаўскага павета? Чаму на безупынныя пытанні на роднай мове ўсе паводзілі сябе як старыя, цяжка выпрабаваныя ў 1956 годзе венгры, калі іх пытаюць сёння пра веданне рускай мовы. Размаўляюць ці не, але напэўна спяваюць штосьці і на беларускай мове. Даведалася я, што ў праграме ёсць вянок народных песень, але выконваюць іх вельмі рэдка, проста „на спецыяльных вечарынах, якія ладзяцца часам так, дзеля «отдыха»". У галоўным хор спявае духоўныя творы, якія найчасцей прэзентуе на гродзенскім Новым замку. Амаль не здараецца ім спяваць у цэрквах. Таму і не было тут праблемы, з якой сустрэўся азоўскі хор. Гэтыя прафесіяналы з азоўскага эстраднага ансамбля пыталіся ці ў філармоніі жанчыны павінны выступаць „у платочках" на галаве.

Здзівіла мяне тое, але толькі з таго моманту, калі я пазнала разнастайнасць працы харыстаў. Капэла не мела такіх праблемаў. Затое яе ўдзельнікі ахвотна расказвалі пра даўнейшыя паездкі і канцэрты. Зацікавіла мяне таксама, калі пасля канцэрта два ці тры разы дырыжор аналізавала выкананне, яшчэ толькі на аснове гуку і вобразу ў камеры. Прафесіяналізму тут дастаткова, але неяк бачу духовыя недахопы. Можа і таму, што, як прызнаюцца спевакі, пераважна працуюць яны ў капэле для дадатковых грошай, з падыходам шабашніка. Нават тое так не перашкаджае ва ўспрыманні ролі хору, бо кожны сам выбірае шлях і прымае рашэнні адносна працы, аднак найбольш баліць абыякавасць да гістарычнай мінуўшчыны Гродна — гэтага чароўнага месца. Нельга аднак забываць пра тое, што і нам часта не хапае пашаны для месца свайго пражывання, не ўмеем пра яго прыгожа і з пасіяй расказваць. Таму і ў гэтым цяжка іх папракаць. Гэта проста прафесіянальныя музыканты, якія сёння, так сама як і ў нас, вядуць звычайную барацьбу за жыццё ў нармальных умовах у нялёгкі час. Паступалі з іхняга боку пытанні, ці наша дзяржава забяспечвае працу пасля заканчэння навукі. Можна тады падазраваць, што часам бывае ім лягчэй. Аднак частка іх мае свядомасць магчымасцей у свабоднай дзяржаве, у якой дзякуючы ўласнай ініцыятыве можаш нават працаваць у сваёй прыватнай школе, што пакуль немагчымае ў Беларусі. Ці падабаецца ім сістэма, дзе абставіны дазваляюць прадаваць мастацкія ўмеласці дзеля памнажання фінансавых сродкаў? Больш свядомыя сітуацыі хацелі б, каб існавала магчымасць такога „продажу". Тады яны сапраўды рашалі б аб сваіх справах. Мелі б проста магчымасць выбару.

Ілона КАРПЮК

Памятаць аб мінулым!

Шмат у нас беларускіх арганізацый, якіх супольнай рысай з'яўляецца нізкая актыўнасць. Праўда, ажываюць яны перад выбарамі ці важнейшымі фэстамі, але на штодзень акунаюцца яны ў салодкай дрымоце. Менавіта гэтым асяроддзям прапаную пэўную ідэю, якая магла б іх крыху ажывіць. Менавіта маю на думцы збор матэрыялаў для біяграфічнага слоўніка дзеячаў беларускага руху на Беласточчыне.

Я ў захапленні ад публікацый доктар Лены Глагоўскай — але гэта ў пераважнай большасці навуковыя артыкулы і датычаць яны самых важных, выдатных, найбольш заслужаных асоб. Аднак час бяжыць і штораз мацней сціраецца памяць аб актывістах меншага рангу, вельмі важных калісьці ў сваіх асяроддзях.

Памятаем гады буйнага росквіту беларускіх культурных ініцыятыў у шэрагу вёсак, але хто сёння прыгадае прозвішча арганізатара драмгуртка ў Мілейчычах ці Вілінаве, папулярнай некалі спявачкі, даўно памерлага скульптара, народнага паэта ці захавальніка помнікаў даўніны з дзесяткаў вёсак нашага рэгіёна. Яшчэ міне трохі часу і людзі забудуць, што ў вёсцы X нарадзіўся мітрапаліт ці епіскап, што з сяла Y паходзіў таленавіты бацюшка-паэт, шматгадовы супрацоўнік Радыё Свабода ці выдатны музыкант-інструктар шматлікіх фальклорных калектываў. А колькі ж выхадцаў з Беласточчыны зрабіла навуковыя ці прафесійныя кар'еры ў Польшчы і на свеце! Думаю, што варта захаваць памяць аб іх для будучых пакаленняў, а некаторых з іх увекавечыць у іх родных мясцінах мемарыяльнай дошкай або школьным міні-музеем.

Гэта занятак на гады і для неабмежаванага ліку ахвотных заняцца справай. Але пачаць яе трэба неадкладна, пакуль у людской памяці яшчэ не ўсё сцерлася!

М. Ц.

Крыжы — доказ нашага існавання

11 мая г.г. у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42 адкрылі выстаўку пад загалоўкам „Крыжы — доказ нашага існавання", якую падрыхтаваў Павел Вошчанка. У музеі ёсць некалькі дзесятак жалезных старых крыжоў, у тым ліку з багатым аздабленнем. Павел Вошчанка вельмі цікава распавядае пра гісторыю праваслаўных крыжоў, пра захаваныя на Гайнаўшчыне старыя могільнікі ды цікавыя надпісы на старых каменных надмагільных помніках. Паказвае іх на каляровых фотаздымках.

Зараз выстаўку наведваюць жыхары Гайнаўкі і навакольных вёсак, а таксама турысты, якія прыязджаюць у Белавежу, Гайнаўку ды ў Белавежскую пушчу. Ужо ў першы дзень працы выстаўкі, наведалі яе турысты м.інш. з Балгарыі.

(мох)

http://litaratura.belarushosting.org

Літаратурныя сайты займаюць значнае месца ў Байнэце. Дзіўнага ў гэтым мала — дзякуючы беларускім паэтам і пісьменнікам наша мова і літаратура выжылі падчас найбольш агрэсіўнай русіфікацыі і паланізацыі. Спадчына такіх сусветна вядомых беларускіх літаратараў як Васіль Быкаў ці Алесь Адамовіч (як, дарэчы, і многіх іншых) дае падставу сцвярджаць, што беларусы, нягледзячы на сваю нацыянальную няспеласць, усё ж такі маюць права на існаванне як народ. Таму не дзіўна, што гэтая самая спадчына натхняе многіх, каб яе нейкім чынам сістэматызаваць. З такой нагоды, відаць, і з'яўляюцца сайты кшталту „Беларускія літаратары", куды мы сёння завітаем.

Месціцца вышэйазначаны партал у Інтэрнэце па адрасе http://litaratura.belarushosting.org. Выглядае ён даволі сціпла і някідка. У гэтай някідкасці ёсць нешта ад уласна беларускай класічнай літаратуры — захапленне ёю прыходзіць не з першых старонак, а толькі пасля прачытання не адной кнігі.

На галоўнай старонцы сайта ўверсе побач з назвай месціцца карта Беларусі, дзе праглядаецца дзяленне на вобласці. Калі клікнуць мышкай на якую-небудзь вобласць, то адразу высвечваецца спіс паэтаў і пісьменнікаў з гэтай тэрыторыі. Зважаючы на тое, што беларускія літаратары жылі, жывуць і, хутчэй за ўсё, будуць жыць не толькі ў сённяшніх дзяржаўных межах Беларусі, адразу выяўляецца галоўны недахоп сайта — геаграфічная абмежаванасць. Яго можна выправіць, калі змяніць назву на „Літаратары Беларусі" ці дадаць спецыяльныя рубрыкі, дзе б знаходзіліся звесткі пра беларускіх аматараў пяра па-за беларускімі межамі. У адваротным выпадку ад пачатку адкідваецца якая-небудзь інфармацыя аб беларускіх пісьменніках і паэтах, напрыклад, Беласточчыны і добра вядомыя там „белавежцы" не трапляюць на Алімп беларускай літаратуры.

На галоўнай старонцы размешчана прывітанне да наведвальнікаў сайта ад яго стваральніка Зьміцера Чырэца. „Вітаю вас, паважаныя наведвальнікі сайта, прысвечанага беларускай літаратуры, — піша ўладальнік партала. — Тут вы знойдзеце інфармацыю аб беларускіх дзеячах літаратуры як гістарычнага, так і сучаснага перыяду. Па меры накаплення інфармацыі пра таго ці іншага дзеяча, сайт будзе абнаўляцца. Пакуль тут ёсць агульныя сведкі пра ўсіх беларускіх дзеячаў. Больш падрабязныя сведкі ёсць пра: Васіля Быкава, Францыска Скарыну, Кастуся Каліноўскага. Калі ў вас таксама ёсць якая-небудзь інфармацыя, звязаная з якім-небудзь дзеячам Беларусі і вы хацелі б змясціць яе на гэтым сайце, то высылайце мне гэту інфармацыю на E-mail: litaratura@gmail.com. Буду вельмі ўдзячны".

Сапраўды, інфармацыя пададзеная пра ўзгаданых аўтарам сайта літаратараў даволі падрабязная. Напрыклад, на старонцы аб Васілю Быкаве мы можам не толькі азнаёміцца з яго біяграфіяй, але і прачытаць які-небудзь быкаўскі твор. Праўда, для гэтага наш камп'ютэр мусіць быць аснашчаны адпаведным абсталяваннем, якое б дазволіла адлюстроўваць інфармацыю ў фармаце zip.

Імя і прозвішча паэтаў і празаікаў, спіс якіх месціцца злева, з'яўляюцца выйсцямі да адпаведных рубрык аб іх. Зважаючы на тое, што данаму сайту ўсяго толькі некалькі тыдняў, бо адкрыўся ён 23 красавіка г.г., праца Зьміцера заслугоўвае ўсялякае павагі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Ні хваліць, ні ганіць

Наўрад ці ёсць сэнс адназначна ацэньваць выступ беларускай дружыны на чэмпіянаце свету па хакеі. Бо з аднаго боку, пасля леташняга шостага месца, жылі надзеі на паўтарэнне такога поспеху, а з іншага — пры абмежаваным выбары выканаўцаў — было наіўна чакаць ад падначаленых „нашага амерыканца" Курта Фрэйзера подзвігаў і скоку вышэй галавы. Так што выніковае 11-е месца — аб'ектыўна наша. Зважаючы яшчэ і на гісторыю выступаў апошняга дзесяцігоддзя. Год жа таму беларуская каманда выглядала мацней па падборы майстроў. Многія з ветэранаў завяршылі выступы за галоўную каманду краіны, а гралі яны ў зборнай галоўныя скрыпкі. Пацвярджэннем таму і гульня на маскоўскім чэмпіянаце „апошняга з магікан" — Алега Антоненкі. Капітан быў на гэтым першынстве сапраўдным лідэрам і не дзіва, што стаў найбольш выніковым у нашай зборнай — 8 ачкоў (5 галоў і 3 перадачы). А вось у іншай стрыжнёвай фігуры дружыны — галкіпера Андрэя Мезіна, які раней выратоўваў у многіх складаных сітуацыях, чэмпіянат выдаўся няўдалым. Невыпадкова, што пасля яго завяршэння наш асноўны брамнік сказаў, што вельмі стаміўся і заявіў пра завяршэнне выступаў за зборную. Хто яе можа ўзмацніць праз год — сказаць проста. Перад гэтым чэмпіянатам беларусы не далічыліся адразу шэрагу ключавых гульцоў. Па розных прычынах не прыехалі ўсе нашы заакіянскія легіянеры (мацнейшы абаронца ў гісторыі беларускага хакея Руслан Салей, а таксама „маладыя ваўкі" — форварды Міхаіл Грабоўскі і Андрэй Касціцын). Зноў федэрацыі не ўдалося ўгаварыць выступіць цэнтрфорварда Аляксея Калюжнага, які ёсць адной з зорак расійскай суперлігі. А іншы „ўсходні легіянер", нападнік Яраслаў Чупрыс атрымаў цяжкую траўму перад самым чэмпіянатам. Так што ўзмацняцца ёсць кім. Галоўным станоўчым фактарам трэба лічыць тое, што за два апошнія сезоны ўдалося правесці змену пакаленняў і прытым захаваць месца ў эліце, што перад наступным першынствам выклікае стрыманы аптымізм.

Расчараваннем чэмпіянату стала бездань паміж „вялікай сямёркай" і астатнімі. Колькі б не гаварылі, што ў хакей навучыліся гуляць усе, розніца паміж прызнанымі фаварытамі і астатнімі проста вялізная. Адсюль і адсутнасць інтрыгі ў многіх матчах, вал вынікаў з буйным лікам і адпаведна зніжэнне глядацкага інтарэсу. За апошняе дзесяцігоддзе „сераднякі" (Швейцарыя, Латвія, Беларусь) толькі час ад часу былі здольныя на лакальную сенсацыю. А на гэтым першынстве мацней звычайнага выглядалі немцы, якія здолелі „зачапіць" аднаго з грандаў — перамаглі чэхаў, праўда, у глабальным сэнсе гэтая вікторыя нічога не дала. У сваім заключным матчы — гульні прэстыжу — беларусы саступілі якраз „тэўтонцам" — 5:6 (заўважым, што Беларусь упершыню прайграла ў афіцыйным матчы немцам).

А чэмпіёнам цалкам заслужана (24-ы раз у гісторыі!) стала Канада, якая ў фінале адолела Фінляндыю — 4:2. Гаспадары турніру, расіяне, якія не заваёўваюць золата з 1993 года (уласна кажучы, гэта іх адзіны тытул пасля распаду СССР), былі змушаны задаволіцца бронзай, мінулагоднія лаўрэаты шведы толькі чацвёртыя.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Пара, мужык, выходзіць у поле

Зноўку закрасавалася вясна. Птушкі з выраю даўно вярнуліся, сваім канцэртам жыццё нам весяляць. Аж ахвота жыць на свеце стала. Хаця з кожным годам чалавек усё больш старэе і весялосць яго пакідае, аднак у маладых ажывіўся маладосці дух. Яны селі на свае сталёвыя аргамакі і айда ў поле. Зноўку палі загаварылі на мове трактароў, машын і гоманам людзей. Вясновыя работы доўга не чакалі. Зямелька нанава атрымала новую порцыю зерня, бо калі вясною зямельку зернем не накорміш, тады ўвосень не будзеш мець чаго збіраць. А зямелька ў нас такая разумная, што калі яе як след дагледзіш, тады і яна табе дабра не пашкадуе і зімку будзеш мець багатую, не будзеш галадаць.

Добры гаспадар вясною з плугам у поле не выходзіць, толькі культыватар да трактара прычапляе і хутка ў поле спяшае. Так што неўзабаве полечка пасеянае зелянінаю зашуміць.

Вось і мяне грукат трактароў выцягнуў на нашай палавіне вёскі, хаця я ўжо палявымі працамі не займаюся. Развязала мяне з імі хвароба і Еўрасаюз. Аднак не ўсядзець у хаце. Штосьці ў поле цягне, як ваўка у лес. Абы толькі сіла была ў нагах і ахвота. А на полі іншае жыццё, не так як у хаце. Тут і падыхаць свежым паветрам можна, задумацца як гэты свет збудаваны, якая ў ім гармонія пануе. Усё жыццём весяліцца, усе Усявышняга за жыццё праслаўляюць — ад чалавека да маленькай мурашкі.

Усё на свеце сваё месца мае. Ці то на зямлі, ці то пад зямлёй, а таксама ў вадзе. Кожнаму тварэнню вызначаны свой час жыцця на зямлі і адпаведная праца. Яшчэ некалькі добрых год назад на нашых палях можна было сустрэць мноства шэрых зайчыкаў. Цяпер колькі я не хадзіў па полі, не сустрэў ні аднаго. Праўда, сустрэў я зайку на могільніку, калі прыбіраў магілы бацькоў пад Провады. І нават запытаў: „Што табе, зайка, месца на полі не стала? Ці чалавека баішся? А можа зайздросныя мужыкі з поля цябе выгналі?" Са сваімі машынамі, тэхнікай ім заўсёды зямлі мала, а ўгнаеннямі і табе, пэўна, здароўе адабралі. Таму твой заечы род прападае. Зайка ведае, што калі чалавек пад зямлёй, дык нічога кепскага яму не пагражае. А калі хто жывы між магіл ідзе, тады і зайка дае драла. Гэта ж не найлепш сведчыць аб нас.

Таксама і курапатак у нас не сустрэць. А, бывала, нядаўна яшчэ, цэлымі грамадамі па полі хадзілі. А калі чалавека сустракалі, з шумам угару падымаліся і чалавеку месца рабілі. У халодныя зімы пад нашы дамы падходзілі, і не гаворачы аб ежу прасілі. Некаторыя сяляне зерне для іх высыпалі. А даўней паляўнічыя і такіх прыгожых птушак стралялі. А колькі з такога маленства мяса? Як кот наплакаў. Яшчэ пройдзе некаторы час і на полі нічога жывога не астанецца. Адны цяпер у нас ваўкі гойсаюць. Ваўка не можна забіваць, ён пад аховаю цяпер, хаця ён вялікія страты мужыку наносіць.

Вось такое цяпер на вёсцы бытаванне. Прыгадаўся мне гэты час, калі на лугах пасвілася многа кароў. Кругом чорна-белыя, чырвоныя і чорныя каровы. А што цяпер? Пустата, як пустыня. Усяму гэтаму Еўрасаюз дапамог. Адну кароўку не аплаціцца трымаць, а хто больш іх мае, дык у аборы трымае. Толькі знай — кармі, падсцілай, а потым выбірай, і даі, каб больш малака здабыць. Аб цане малака не думай. Тыя, што малако забіраюць, пастараюцца мужыку так заплаціць, каб яго не абагаціць. Ты, мужык, не лічы даходу, працуй! Рукі выцягай і не наракай. Такая, мужык, твая доля. А можа і на кароў надыдзе пара і прападуць яны як коні, зайцы, курапаткі? І зязюлек ужо не чуваць, бо ўсё на зямлі мае свой час.

Вось з такімі думкамі вярнуўся я дахаты. А жонка мяне сустрэла такімі словамі: „А што, не вытрымаў? Павалокся ў поле". Хто ў такую пару ў хаце вытрымае? Абудзілася і да нас прыйшла вясна. Усё жывое, каб на сонцы пагрэцца, на двор выпаўзае. Таму і я сам выйшаў у поле свежым паветрам падыхаць і паглядзець, як людзі працуюць. Спрацаваныя адыходзяць, каб маладым месца зрабіць. Яны мноства сілы маюць і разумнейшыя за нас. Няхай працуюць і багацеюць. Мы дагэтуль не патрапілі разбагацець і надалей нам не пашанцуе. Мы ім будзем дапамагаць і раіць у цяжкія хвіліны. Наш час ужо прайшоў. Адно асталося Госпада ўмаліць, каб дазволіў нам яшчэ пажыць. А жыццё такое цікавае, з кожным днём усё цікавейшае. Аднаго шкада — з кожным днём ад нас усё хутчэй і хутчэй час уцякае. А можа мы, старыя, не можам ужо ісці ў нагу з часам? Не пара аб гэтым думаць, калі вясна на двары. Трэба цешыцца яе красою, бо невядома ці наступнай яшчэ дачакаем.

Грыша МАРОЗ

Ваня Міхальчук — *Радзівілаў*

Так у Трасцянцы называюць Івана Міхальчука, якому 20 мая г.г. споўніцца 80 гадоў. Жыве ён ціхенька са сваёй жонкай Надзяй у першай хаце з правага боку, едучы з Нарвы. Называюць іх *Радзівілавы*, бо ў сям'і расказвалася, што прадзед паходзіў ад князя Радзівіла, але цяпер дзядзька Іван не ведае сам, ці то праўду гаварылі, ці можа смяяліся. Бацькі Вані, Антон і Марыя, мелі чацвёра дзетак — двух сыноў і дзве дачкі. Іван быў наймалодшы, таму і сёння ўсе ў вёсцы завуць яго Ванем.

Перад вайной бацькі абраблялі паўучастка зямлі, а дзеці хадзілі ў польскую школу, якая была тут на месцы, ну і, вядома, дапамагалі сваім бацькам у гаспадарцы. Потым адна сястра служыла ў жыдоў у Заблудаве, другая пільнавала дзяцей на месцы ў багацейшых гаспадароў — і гэтак зараблялі сабе на вопратку.

Ваня, наймалодшы, якраз да 1939 года скончыў 4 класы польскай школы, а як прыйшлі саветы, то яшчэ 4 класы — савецкай. У 1941 годзе яму споўнілася 14 гадоў, а тут і немцы. Адразу дастаў ён ад іх пашпарт і пагналі да работы. Сястру і брата забралі на прымусовыя работы ў Германію, а Ваня вазіў каменне і працаваў у лесе — ставіў фасметры пад Грыбоўшчынаю. Начлег быў у Случанцы, трэба было хадзіць да цяжкай працы. Там працавалі маладыя хлопцы з усяе Трасцянкі. Хіба, што хтось выкупіўся. І так трое дзяцей Антона і Марыі Міхальчукоў працавалі на немцаў, бо найстарэйшая дачка была ўжо замужняй.

Іван Міхальчук з жонкай Надзяй

Дзядзька Іван Міхальчук помніць той фронт у 1941 годзе, як немцы ехалі і спявалі: „Тай, лай, лай, два тыдні і Масква". Зараз гміну зрабілі для Трасцянкі ў Міхалове, а потым у Рыбалах. Івана прызывалі на камісію ў Рыбалы, каб адправіць у Прусію на работы. Усё ж такі яго не забралі, бо там працавалі ўжо і сястра, і брат. У час фронту ў ліпені 1944 г. немцы ўжо не спявалі сваіх бадзёрых песень, бо „спявалі" ім ужо кацюшы.

Пасля вайны маладыя хлопцы думалі як зарабіць сабе на вопратку. Паехалі ў Прусію. 12 км за Шчэцінкам працаваў малады Ваня ў лесе, потым у Шчэціне складаў цэглы з разбураных дамоў. У 1948 годзе яго паклікалі на вайсковую камісію, але ў войска яго не ўзялі. Ад 1948 года зноў жыў у Трасцянцы. У 1949 годзе вучыўся майстрэству ў блізкіх Саках. А 19 лістапада 1950 года ажаніўся ён з прыгожай, працавітай дзяўчынай Надзяй Максімчук і задумаліся як жыць далей. Пайшоў ён на працу на будову ў Беласток і сталі будаваць сваю хату, якую скончылі ў 1952 годзе і перайшлі жыць на сваё. У іх былі ўжо дзве дачушкі — Ліда і Валя. Дзеці раслі, бацькі працавалі і ішло мірнае жыццё. У калгас *Радзівілавы* не запісаліся, хоць Ваня скончыў курсы догляду авечак. Той трасцяніцкі калгас у 1956 годзе разваліўся і не прыйшлося калгасных авечак даглядаць.

У сямідзесятыя гады Іван Міхальчук працаваў сторажам у мясцовай школе і вельмі добра паліў у печках, таму вучні і настаўнікі ніколі не мерзлі. У 1983 годзе ягоная жонка Надзя мела выпадак. Неяк ссунулася яна з фуры загружанай сенам і ўпала на галаву. Доўга ляжала яна ў шпіталі і пасля ўжо не магла цяжка працаваць на гаспадарцы. А потым яшчэ быў палом нагі і плячо карова збіла. Неўзабаве лекары далі ёй другую інвалідную групу. А потым і Іван пайшоў на пенсію ўзамен за здадзеную зямлю. Дочкі Ліда і Валя даўно павыходзілі замуж і жывуць у Беластоку. Да дзядоў часта прыязджаюць унукі. Надзя і Іван вельмі гасцінныя людзі, ніколі так не бывае, каб наведваючых іх не пачаставалі чаем ці кавай, а то і чым мацнейшым...

Жадаю ім многа, многа год разам у добрым здароўі і вельмі многа радасці ў жыцці.

Рута

У Кляшчэлях на рынку

Рашыў я паехаць у Кляшчэлі на рынак ды пацікавіцца цэнамі, даведацца як фармуюцца яны напрадвесні. Было гэта ў панядзелак 30 красавіка. Кірмаш быў вельмі ўдалы. Ад варот аж пад канец рыначнай пляцоўкі, па абодвух баках бруку, як салдаты ў шарэнзе выстраіліся латкі гандляроў. Чаго тут не было: расада агародніны, кветкі для агародчыка і штучныя для аздобы, абутак, галантарэя, касцюмы, сельскагаспадарчыя прылады і харчовыя прадукты, ранняя агародніна, прадметы хатняга ўжытку, камбікармы для свойскай птушкі і жывыя куркі... Пры канцы рынку, пад агароджай, земляробы прадавалі збожжа, бульбу ды парасят. Сярод натоўпу сустрэў я шмат знаёмых мужыкоў з Москаўцаў ды іншых вёсак, з якімі я калісьці спатыкаўся, калі з кінаперасоўкай да іх заязджаў. З многімі наладзіў я размову.

На кляшчэлеўскім рынку заўсёды вялікі рух

— Як парасяты цэняцца? — пытаю селяніна, які першы побач дарогі стаяў.

— Я па 160 злотых прадаў, але і па 200 зл. цанілі, — адказвае земляроб. — Парасят нарасхват бралі. Гандляр на машыне прыехаў, ды скупкай займаўся. Бачыў я як за пару чалавеку па 180 зл. плаціў, а сам гэтыя ж парасяты іншым па 220 зл. прадаў...

Вось, даражэнькія, як справа маецца. Селяніна з усіх бакоў абдурваюць, а прайдзісветы нажываюцца. У кулак з нас смяюцца. Іншыя прыклады. З пачаткам года ў крамах падаражэў хлеб. Аргументавалі, што мука даражэйшай стала, бо збожжа не хапае. І праўда. Некалькі месяцаў таму скупшчык на рынку ў Кляшчэлях за метр жыта па 70-80 зл. плаціў, а зараз адно 40 зл. дае. Гавораць, што мука патаннела, бо з імпарту збожжа паступіла. За хлеб аднак у крамах даражэй плацім. А што са свінінай? На скупцы селяніну за кілаграм жывой вагі першага гатунку па 3 злоты з падаткам ПДВ плацяць, а за большыя штукі яшчэ менш. Аб цэнах мясных вырабаў у крамах лепш не гаварыць. Мікола Лук'янюк раней у „Ніве" аб тым пісаў. Праўда, міністр Лепэр абяцаў сялянам стаўку на 3,60 прыбавіць, але слова не стрымаў. Вакол пальца, значыцца, людзей адвёў! Такая наша шэрая рэчаіснасць і рыначная эканоміка.

Дарэчы, цэны збожжа на рынку невысокія былі. За метр жыта 50 зл. прасілі. За авёс таксама. Пшаніцу і ячмень цанілі па 60 зл., а лубін — па 120 зл. Ранняя агародніна каштавала вось так: памідоры — 6 зл. за кілаграм, радыска — 1 зл. пучок, салата — 1,50 зл. Расада памідораў, якой шмат было на рынку, цанілася ад 80 грошаў да залатоўкі за штуку. Варта адзначыць, што ў Кляшчэлях на рынку напрадвесні, як штогод так і зараз, рух вялікі. Адны прадаюць, а іншыя купляюць. Кожны на свой спосаб намагаецца, каб ад гэтай здзелкі выручка атрымалася: прадавец цану пастаўляе паводле рыначных прынцыпаў, а пакупніку хочацца чым танней заплаціць. Такое ўжо воўчае права натуры.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2007 r. upływa 5 czerwca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połudn. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 835 egz.

Суседскія былі

ФУТБОЛЬНЫ МЯЧЫК

Кажуць, што вялікі Мішэль Настрадамус з такой дакладнасцю прадказаў дату развалу Савецкага Саюза, з якой можна прадказаць вынік матча па футболе паміж зборнай Вялікабрытаніі і камандай сярэдняй школы вёскі Малыя Балванішкі, якая выйдзе на поле пад кіраўніцтвам маладога настаўніка фізкультуры Анатоля Каспяровіча, які за два гады сваёй трэнерскай працы так і не змог выбіць у адміністрацыі навучальнай установы грошы хоць на адзін футбольны мячык. З тае бяды вырашыў ён купіць тую каўчукавую забаву за свае фінансавыя збераржэнні. Толькі грошай на штосьці больш-менш талковае не хапала. І тады малады энтузіяст на ніве фізічнай культуры, які жыў навязлівай марай выхаваць хоць аднаго алімпійскага чэмпіёна, вырашыў падзарабіць крыху па-за межамі школы. Яго знаёмы бізнесовец вельмі хутка растлумачыў, што новыя межы старая ўлада збудавала, але пакінула там для сябе заканадаўчыя і рэальныя дзіры, каб можна было хутка і без асаблівай напругі разбагацець. Гэтым могуць пакарыстацца і іншыя. Ды вось толькі ні той бізнесовец, ні вялікі прадбачнік Настрадамус, якога Анатоль чытаў з захапленнем, так і не растлумачылі беднаму настаўніку галоўных правілаў новага жыцця. І пра тое, што ён, адразу пасля таго, як грошы падзяруць яго першую кішэнь, не толькі не вернецца працаваць у школу, але і забудзецца што тая ёсць. І не давялі да яго новых правілаў існавання багатых людзей таго часу. Ні таго, што трэба плаціць бандытам, ні што мусіш даваць хабар тым, хто пры ўладзе.

І неяк Толік выскачыў з поля зроку і тых, і іншых. Заўважылі Каспяровіча толькі тады, калі ён у самы шыкоўны мінскі рэстаран прыехаў з прыгожай бландзінкай на новенькім джыпе „Чырокі". Убачылі і аслупянелі. Локці сабе сталі кусаць, што чалавек аж так разбагацеў, а яны з яго ні цэнта не знялі. Бандыты аказаліся спрытнейшымі за ўладу і выправілі сваю памылку ўжо праз дзесяць хвілін шляхам экспрапрыяцыі машыны з рэстараннай стаянкі.

Застаўшыся без машыны, Каспяровіч ад адчаю зноў узяўся пачытаць Настрадамуса. Але былы прадказальнік нічога не патлумачыў новаму багачу. Затое сябра-бізнесовец усё вытлумачыў. І назаўтра Анатоль ужо сустракаўся з кіраўніком адной з бандыцкіх брыгадаў Мінска ў сталічным бары.

— Мне трэба вярнуць машыну, — пачаў ён адразу з канкрэтыкі.

— Ні праблема, — супакойвае яго бандыт. — Плаціш дзесяць тысяч зялёнымі амерыканскімі купюрамі і машына прыедзе туды, куды скажаш.

— Колькі?! — абурыўся Анатоль. — За сваю машыну і такую суму! Нізашто.

— Як хочаш, — спакойна адказвае бандыт. — Размова не атрымалася.

Пакуль Толік шукаў праўды ў міліцыі, бандыты паехалі на яго „Чырокі" ў Расію, недзе ў Валгаград і там прадалі. А як малады бізнесовец убачыў, што міліцыя сама падкормліваецца ў бандытаў і дапамагаць яму не збіраецца, узяў дзесяць тысяч і зноў папрасіўся ўбачыцца з галоўным бандытам сталіцы. Той як убачыў грошы, адразу забраў і паабяцаў на гэтым тыдні вярнуць тэхніку. Бандыты паехалі ў Валгаград, укралі машыну ў таго, каму прадалі, і вярнулі яе Каспяровічу.

Але гэта чамусьці прыйшлося не даспадобы абакрадзенаму і той звярнуўся за дапамогай да валгаградскіх бандытаў.

— Эй, братан, — тлумачыў па тэлефоне валгаградскі бандыцкі шэф мінскаму, — так не робіцца. Прадалі чалавеку крадзеную рэч і адразу спёрлі. Што пра нас, бандытаў, людзі падумаюць? Зусім давер да нас згубяць. Машынку трэба вярнуць.

— Нічога не аддадзім, — адказвае мінскі шэф. — Мы ўжо грошы ўзялі за тое, што вярнулі машыну ў Мінск. Падманваць кліента нельга. Такі закон бандыцкага гонару.

Ну то валгаградскія прыехалі ўночы ў Беларусь і зноў укралі Толікаў джып. Тады мінскія паехалі ў Расію і ўкралі яго яшчэ раз. А пасля так узлаваліся адны на другіх, што вырашылі правесці перамовы на нейтральнай тэрыторыі, на мяжы, паміж беларускай і расійскай заставамі і пры поўным узбраенні. Памежнікі, як убачылі да зубоў узброеных людзей, кінулі працу, заставы і табельную зброю, ды паўцякалі з мяжы хто куды. Начальнік расійскай заставы, кажуць, ад страху хацеў застрэліцца. Але рука з таго жаху так дрыжэла, што не змог папасці сабе ў галаву і, сапсаваўшы ўсе патроны, таксама некуды знік. А бандыты пастаялі гадзіны тры, наставіўшы зброю адны на другіх, і вырашылі перамовы перанесці ў Польшчу ды запрасіць на іх прэтэндэнтаў на джып. І ўжо ў беластоцкім бары, пакінуўшы зброю звонку, селі за стол.

— Гэта мая машына, — кажа Толік. — Я за яе плаціў.

— Я таксама, — не здаецца другі прэтэндэнт.

Тады той гэнаму кулаком у рыла. А гэны таму таксама. Ды і бандыты пачалі лупіць адны другіх. Усю мэблю ў бары аб пабрытыя на лыса галовы пераламалі. А як скончылася чым біцца, параіліся паміж сабой і звярнуліся да прэтэндэнтаў на „Чырокі".

— Выйсце толькі адно, — тлумачаць. — Джып трэба прадаць, а грошы падзяліць на тры часткі. Дзве часткі вам, а трэцяя, самая вялікая, нам.

— Не! — зараўлі ў адзін голас уладальнікі машыны так, што са столі звалілася люстра проста бармену на галаву.

— Калі не пагаджаецеся на гэтую прапанову, — тлумачаць бандыты, — то мы маем другую. Мы машыну зноў скрадзем і пакінем яе сабе.

— Згодны на першую прапанову, — адразу памірыліся ўладальнікі машыны, па-сяброўску пацісналі рукі, абняліся як родныя і зрабілі так, як параілі бандыты.

Але толькі Толік са сваёй доляй вярнуўся ў Мінск, як ужо схамянулася ўлада. Выклікаюць яго ў падатковую інспекцыю.

— Вы няправільна падаткі плацілі, — сцвярджаюць і культурна так размаўляюць, не тое што тыя хамаватыя бандыты. — Зараз вам трэба або пакласці пяцьдзесят тысяч долараў у бюджэт краіны, або дваццаць пяць нам на лапу. Выбірайце.

Каспяровіч толькі крыва ўсміхнуўся. Дастаў сваю долю ад продажу джыпа і разлічыўся з уладай. Абы толькі адчапіліся. І застаўся зноў без нічога. Пасля пазычыў у сябра, купіў новенькі мячык і білет да Малых Балванішкаў. Сеў у першы аўтобус, адкрыў кніжку любімага Настрадамуса і паехаў, чытаючы, зноў у сваю школу. Паехаў са старой добрай марай выхаваць у сваім жыцці хоць аднаго алімпійскага чэмпіёна.

Віктар САЗОНАЎ

20.05 – 26.05

Баран (22.03. — 20.04.) Мяшанка розных пачуццяў, таксама і нейкай немачы. Адчуванне, што змагаешся з нябачным ворагам, а можаш быць ім і сам ты. Ды аграмадная моц, якую накіруй на спорт патрабуючы дакладнасці і засяроджання, мастацтва. Канструктыўна разгружай стрэс. Карысны час на новыя знаёмствы; справішся з фінансамі.

Бык (21.04. — 21.05.) Шанц на новыя надта ўзрушаючыя знаёмствы. Нявінныя кантакты ці старое сяброўства могуць нечакана змяніцца ў палымянае каханне! Ды шмат што будзе цябе даводзіць да злосці; прытушы агрэсію і гнеў, каб гэтага не адхварэць.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Шмат нагод для інтэлектуальнага і духоўнага развою. Вернецца згубленае натхненне. Шукай кампаніі маладых, энергічных, беспраблемных асоб.

Рак (22.06. — 23.07.) Вабнасць, спакушальнасць, багатае кампанейскае жыццё. Не падвядуць цябе твая другая палова і сябры. Можаш пазнаёміцца з кімсьці адухоўленым, але і стаяўшым моцна на зямлі. На працы хтосьці схоча даказаць, што ў сапраўднасці „пацягвае за шнуркі".

Леў (24.07. — 23.08.) Хочаш зарабіць? Назірай за біржай! Рэгенерацыйныя здольнасці, жарснасць, а нават заўзятасць. Не занядбаеш сваю прафесійную пазіцыю і сяброў. Да 23.05. можа трапіцца крызіс у фінансах.

Дзева (24.08. — 23.09.) Вялікая празорлівасць; будзеш ведаць, у якім напрамку падацца. Твая фантазія і інтуіцыя падкажуць табе развязкі, якія могуць іншых кінуць на калені! Пі многа вады, зёлкавых заварак, еж зеляніну.

Шалі (24.09. — 23.10.) Захочацца зашалець, перажыць фантастычную прыгоду. Многія справы закончаца паспяхова. Да 21.05. не спадзявайся шмат па абяцанках. Хтосьці верне табе грошы (мо нават і казна!).

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Урэшце выкараскаешся з напружання. Хатнія праблемы гэта твая спецыяльнасць. Можаш не справіцца з тэрмінамі. Не слухай падшэптаў інтуіцыі, бо не зможаш адрозніць прадчування ад уласных апасак; лепш разлічвай на здаровы розум.

Стралец (23.11. — 22.12.) Будзеш цярплівы, цвярозы ў думках. Твае мары здзейсняцца, толькі трымайся свайго шляху. Не прапусціш нагод да рамантычных і жарсных сустрэч. Крыху пагоршыцца здароўе, калі ты не вылечыў да канца нейкай нямогласці.

Казярог (23.12. — 20.01.) Паслядоўнасць, разумовая дысцыпліна. Дзякуючы напружанай працы давядзеш справы да канца (асабліва спраўна пойдзе з рамонтам). Не крытыкуй на працы, асабліва шэфа ў прысутнасці працаўнікоў! Калі хочаш зарабіць, лепш пакінь некарысныя праекты, не думай асабліва аб капіталаўкладаннях.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Ажыўленне ў кампанейскіх кантактах, інспірацыі для змены ў пачуццёвым жыцці. Знакаміты час на любоўныя спатканні! Не слухай парад незычлівых людзей (да 23.05. — ніякіх сур'ёзных вырашэнняў!).

Рыбы (20.02. — 21.03.) 21-25.05. можаш пхнуць дапераду ўсе найважнейшыя справы. Не падвядзе цябе інтуіцыя, якая падкажа табе найбольш адпаведную развязку. Ад 25.05. Нептун ідучы ўзад прадказвае шмат праблем, недахопаў, адставанне, спешку, бяссонніцу.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. бяспамяцтва, парушэнне памяці, пры якім немагчыма ўзнавіць сфарміраваныя раней паняцці, уяўленні, прагал у прыпамінанні = 22 _ 18 _ 19 _ 20 _ 21 _ 17 _ 29;
2. круглаваты кавалак якога-небудзь мяккага рэчыва, нешта скамечанае, скручанае = 10 _ 11 _ 12 _;
3. не верх = 13 _ 14 _ 15 _;
4. высокі гук, вельмі тонкі крык, напр. мышыны = 25 _ 26 _ 28 _ 16 _;
5. жыхар Прагі = 23 _ 24 _ 2 _;
6. травяністая і паўкуставая дзікарослая расліна з прадаўгаватым ядомым лісцем кіслага смаку = 27 _ 9 _ 3 _ 4 _ 1 _;
7. кусок шкла, устаўлены ў аконную раму = 5 _ 6 _ 7 _ 8 _.

(ш)

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19	20				
21	22	23	24	25	26	27	28	29			

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 15 нумара

Дэпеша, слоўнік, ёрш, знаць, печанег, рапс, алень, епіскап, гешэфт, пясок, опера.

Рашэнне: **Слёз не пераплачаш, песень не перапяеш.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960

Ніва

ПРА ЛІТАРАТУРУ

Бульба прапала!



Народная прыказка, быццам *ад крадзенага не патаўсцееш*, зусім не прыстае да Чабутковых. Наадварот, у сямейцы ўсе маюць падвойныя падбародкі. Адзінае выключэнне — гаспадынька, якую з-за выгляду, а яшчэ больш з-за характару празываюць у Н. *блядзь худая*. Жыццёвая мудрасць гэтай мізэрнай кабеціны зводзіцца да адной фразы:

— Трэба ўмець камбінаваць.

На практыцы гэта значыць адно — красці. Праўда, адкрытасць і бессаромнасць, з якой Чабуткі крадуць усё што пападзе ім пад руку, даўно абрыдла і пераелася. І нават злосці ўжо на іх не хапае. Калі зараз прападзе тое-сёе ў Н., людзі абураюцца на... саміх сябе. Што не ўпільнавалі!

— І нашпарыць такіх дурняў не аплачваецца, — махае рукой Уладзік Максімкаў, апошняя ахвяра — бо не *датрэ*. Бі — забі, а ён і так сваё зробіць, пойдзе красці.

* * *

Яшчэ да нядаўна мой субяседнік хіхікаў з пенсіянерак, у якіх Чабуткі свіснулі курку або падрыхтаваныя на мароз дровы. А зараз абакралі і яго — такога разумнага! І можна пахваліць іх за прафесіяналізм, бо вясковага хітруна абабралі проста ў белых рукавічках. Канкрэтна — ягонымі рукамі.

— Цяпер *мая* жыць не дае, — наракае Максімкаў на жонку, — ёлупам абзывае.

Згодна з лакальнай псіхалогіяй, уся віна і злосць, пасля інцыдэнту, была накіравана не на злачынцу, а на бедную ахвяру. Значыць, на няшчаснага Уладзіка. Што не паспеў зрабіць сваёй справы перад Чабуткамі. А хто ведае — можа і сам іх яшчэ заахвоціў сваімі п'янымі мовамі.

— Бо раз мой першы кум стаў наракаць, што бульба ў яго пагніла. Няма чым пасадзіць. Ну, і я кажу яму: „Ты, Косця, не п..., прыйдзі да мяне, у мяне поўная ямка. Усім хопіць. Мы сваякі..."

Цяжка сказаць якім шляхам звестка пра поўную ямку бульбы дайшла да Чабуткоў. У бар „Амазонка", дзе кумы за півам „дзяліліся" бульбай, Чабутковых здаўна не пускаюць. Нават, калі той-сёй з іх прыпутаецца са сваім грашаком. Першая і апошняя прычына — эстэтычная. Зладзейчыкі напіваюцца даўсрачкі. Тады абураная частка грамады бярэ іх за каўнер і кідае за парог. Сінякі і раны Чабуткі прымаюць з пакорай — як належнае. Хоць іх пабілі ў Н. сто разоў, тыя ні разу не пазванілі на паліцыю.

— А чаму вы не выклікалі паліцыю? — пытаю абкрадзенага субяседніка. — Ім лёгка было б даказаць віну.

— А што гэта дасць? — паціскае плячыма мой субяседнік. — Калі і прыедуць, то замест злодзея шукаць, будуць да цябе прыдзірацца. Ад злосці, што ім галаву такімі пусцякамі займаеш...

* * *

На жаль, не ўдалося пагутарыць мне хоць з адным прытомным прадстаўніком роду Чабутковых. Бацька сям'і валяўся пад шопкай, проста на зямлі. Яго рукі былі заламаныя дазаду і павязаны бабскімі калготкамі. Сыны — іх тут сямёра, ляжалі як лянівыя каты перад тэлевізарам і дзіка рагаталі. Разам і дзве дачушкі. Дзеўкі, хоць маладзенькія, ужо без зуба спераду. Чабуцяня, падобнае на пелікана, кінула матам, а пасля спыталася ў мяне: „Czy szukasz guza?"

— Не, шукаю вашу матку, — сказала я найбольш лагодна і адначасна строга.

У адказ нехта гучна... пернуў. Пасля пачуўся смех, які і без псіхіятрычнай практыкі назавеш смехам крэцінаў.

На стале, дзе стаялі нямытыя талеркі, бзыкалі абуджаныя вясновым сонейкам мухі. Смецця, якое ляжала ў кутках, хапіла б на поўны воз. Праз галаву прайшла практычная думка, каб гэтыя залежы бруду загрузіць на раскідальнік і скарыстаць у якасці гною. Хоць бы пад бульбу. Хоць не — сам эфект напалохаў мяне. Гэты пах атруціў бы апошніх з магікан. У ім было ўсё — бяда, дурная хітрасць, безнадзейнасць, хвароба. Калі параўнаць пах сапраўднага гною з хлява і пах хаты Чабуткоў — першы здаваўся французскай парфумай.

Маці сям'і, як аказалася, таксама пайшла „ў рэйс".

— Зноў напілася як свіння, — заявіла мне шэптам пенсіянерка, Любка Б. — Адзін чорт ведае дзе і з кім яна зараз шляецца.

* * *

— To poniżej wszelkiej krytyki, — пані Аля з сацыяльнай дапамогі ўжо трынаццаты год дапамагае Чабуткам. Наракае, што няма там надзеі на нейкую паправу. Наадварот, расце новая змена беспрацоўных, ніхто з нашчадкаў старых Чабуткоў — іх дзевяць асоб — не закончыў хоць бы прафесійнай школы.

— Тры дні таму прыперлася на ровары іх маці і стала вішчаць. Дамагалася ад мяне грошай, — пані Аля кажа, што з-за іх сама пападзе ў псіхушку.

— Як не дасі, то павешусо! — пагразіла на канец. Тады апякунка дала ёй дваццаць злотых са свайго кашалька — каб мець чыстае сумленне.

Псіхічны шантаж, што дасканала разумеюць Чабуткі, дзейнічае толькі ў дзяржаўных установах. Бо ў Н. такую пагрозу проста высмеялі б! Той-сёй сам бы стаў намаўляць, каб няшчасныя чым хутчэй з сабой пакончылі. Нават такі бацька хросны — Уладзік Максімкаў. Патапіў бы іх як шчанят уласнымі рукамі. Толькі сябе шкадуе:

— Бо бяды набярэшся!

Любка Б. таксама ахвотна пазбавілася б клапатлівых суседзяў. Апавядае, як зза іх, без харчоў на Вялікдзень засталася. Удава купіла палову свінкі, нарабіла каўбас, павэндзіла кумпячкі і паляндвічкі, ды выглядала прыезду ўнукаў. Аж тут сваяк нечакана памёр, мусова было на мярліны з'ездзіць.

— Я прыязджаю дахаты, а тут у мяне лядоўня пустая. То я сама ледзь тады не памерда ад жалю.

— І што вы тады зрабілі? — пытаю.

— Села і плакала ўсё свята.

* * *

Уладзік Максімкаў найбольш вінаваціць сябе ў тым, што дапамог абакрасці сябе сваімі рукамі. Бо ён адзін з Н. ніколі не адмаўляў у дапамозе Чабуткам.

— Я ж ім палову дзяцей ахрысціў. Ніхто не хацеў з імі братацца. А я з літасці — і каб наша праваслаўная вера не прапала...

А як было з гэтай пакражай бульбы? Звычайна. Да ямкі, якая знаходзіцца дзвесце метраў за вёскай, на ўзгорку, Уладзік пайшоў разам са шлюбнай Ірэнкай.

— Яна набірала ў кашы, а я выцягваў іх наверх і сыпаў у мяшкі. Цэлы дзень гаравалі. Ужо дабывалі апошні мяшок, як пазваніў мабільнік. Званілі з Дома культуры — запрашалі на прэзентацыю медычнай апаратуры. Для кожнага ўдзельніка прэзентацыі арганізатары, якія прыехалі да іх аж з Сілезіі, абяцалі добры падарак.

— І я, як добры дурань, пагнаўся. Жонка таксама была рада, бо якраз набліжалася пара тэлесерыяла „Мода на поспех". Яна стралой паляцела дахаты і ўжо не думала пра бульбу. А раніцай не было ўжо пра што думаць. Бульба прапала.

— Дык і чужыя зладзеі маглі яе за ноч павазіць, — стаю ў абарону Чабуткоў.

— Не-не, — не верыць мой субяседнік. У яго жалезны аргумент.

— Там не было слядоў машыны. Відаць, што гэта зрабілі свае... — Уладзік Максімкаў не можа зразумець толькі аднаго: як лянівыя Чабуткі змаглі за ноч прыбраць яго дваццаць сем мяшкоў! Гэта табе не жарты!

— І я не магу зразумець: чаму Уладзік Максімкаў нічога не робіць?

— Баюся чапаць тое г... — махае рукой. — Яшчэ скалечыў бы або задушыў.

Праз момант уяўляю, як хросны бацька душыць сваіх хроснікаў і як прытым прапагандуецца ідэя нашага праваслаўя... Здаецца, мой субяседнік адчувае мае думкі. Цяпер і сам цягне ў бок сямейных сувязей. Вядома, зноў знаходзіць прычыну сваёй віны.

— Мабыць, нехта даказаў ім, што абяцаў падзяліцца бульбай з кумам Косцем. І, відаць, яны пакрыўдзіліся, што пра іх не падумаў. Гэта так, быццам я сам іх абакраў!

Ева СЦЕПАНЮК

На шляху Скарыны і Купалы

Інстытут сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага Расійскай акадэміі навук у Маскве выдаў у 2006 годзе цікавую кніжку Аляксея Каўкі пад загалоўкам ***„От Скорины до Купалы. Белорусская литература в контексте национально-культурного возрождения".***

У гэтай кнізе адзін раздзел прысвечаны дзейнасці Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" ў Польшчы, з якім хочам пазнаёміць нашых чытачоў.

* * *

Тэма замежжа заахвочвае ўспамянуць аб беларускай літаратуры ў Польшчы — малавядомай расійскаму чытачу. Абодва рэчышчы літаратурнага патоку — эміграцыйнае і дыяспарнае — адлюстраваны ў „Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя" (у чатырох тамах, том 4, кн. 2, Мінск 2003 — раздзелы Уладзіміра Гніламёдава і Лідзіі Савік).

Там, на польскай Беласточчыне, ад вякоў у беларуска-этнічным анклаве, які пасля Другой сусветнай вайны апынуўся ў межах суседняй дзяржавы, існуюць свая культурна-гістарычная глеба, свая грамадская сістэма, свае цывілізацыйныя імкненні. Свой, зразумела, прыродны краявід, авеяны патаемнымі, амаль сакральнымі шумамі Белавежскай пушчы, якая размяжоўвае і збліжае абодва славянскія народы — беларусаў і палякаў. Лірычныя флюіды гэтай запаведнай прасторы пабуджаюць думкі і пачуцці амаль кожнага мастака слова.

Легендам і прытчам Беластоцкага краю прысвечаны кнігі эсэістыкі Міколы Гайдука „Аб чым шуміць Белавежская пушча" і „Легенды Беласточчыны", ён таксама аўтар раманізаваных нарысаў аб гераічным мінулым народа, аб падзеях, подзвігах дзяржаўных дзеячаў даўняй Беларусі ў абарону самабытнасці і незалежнасці айчыны (зборнік „Паратунак" і інш.), якія ўзбагацілі айчынную літаратуру арыгінальным дасведчаннем эстэтызацыі гісторыі, што крыху раней класічна здзяйснялася ў аповесцях і раманах Уладзіміра Караткевіча.

Характэрная і назва Літаратурнага аб'яднання „Белавежа", амаль паўвекавы шлях якога адзначаны добрай сотняй паэтычных і празаічных кніг пісьменнікаў-„белавежцаў", якія распараджаюцца таксама ўласнымі перыядычнымі выданнямі — штотыднёвікам „Ніва" і штогоднікам „Тэрмапілы". Нядаўна пачаў выдавацца полімоўны літаратурна-крытычны штогоднік „Annus Albaruthenicus: Год Беларускі", з удзелам аўтараў з Польшчы, Беларусі і шэрагу заходнееўрапейскіх краін.

Высакародны ўплыў пушчанскай аўры адчуваюць на сабе многія мастакі слова. Прыкладна, Алесь Барскі (Аляксандр Баршчэўскі) — адзін са старэйшын літаратурнага руху на гэтым унікальным арэале беларуска-польскага пагранічча.

Белавежа!
Ты мой акіян,
Апускаю пяро, як вясло,
З гарадоў да цябе плыву я,
Каб сабраць ураджай —
Жнівень слоў.

Узрушае аналагічнае прызнанне яго малодшага калегі па пяру Юрыя Баены — эмацыянальна больш стрыманае, скупаватае, хоць з не менш шчырым унутраным перажываннем традыцыйнага матыву:

Толькі ў Пушчы маўчым мы.
У Белавежы нашай,
Святыні нашай!

(Юрый Баена, „Святыня")

Дык Белавежа — не толькі, не проста кранальны пейзажны фон. Гэта — і духоўны цэнтр, нацыянальна пацверджанае „я" паэта, якое стала галоўнай стылістычнай фігурай многіх лірычных перажыванняў:

Я беларус, рос у сялянскай гушчы,
Сярод палёў, уквечаных лугоў,
Пад дзіўны гоман Белавежскай пушчы,
Пад заліўныя трэлі салаўёў.

(Віктар Швед, „Я — беларус")

Нельга таксама не ўспамянуць аб багацейшых асветніцкіх традыцыях Беластоцкага краю, Падляшша. Тут распаложаны Супрасль і Заблудаў — у мінулым знакамітыя цэнтры старабеларускай і ўсходнеславянскай пісьменнасці. З адкрыццём у 1822 годзе старажытнага Супрасльскага рукапісу звязана самаахвярнасць на ніве славянскай філалогіі Міхаіла Баброўскага — фактычнага ініцыятара навуковага беларусазнаўства. Адгэтуль, ад пушчанскіх ваколіц упершыню прамовіла да беларускага люду „Мужыцкая праўда" Кастуся Каліноўскага. Тут пачаліся жыццёвыя дарогі гісторыка-публіцыста, беларускага патрыёта ў парадаксальнай „заходнерускай" іпастасі Міхаіла Каяловіча, украінскага і беларускага этнографа, фалькларыста, літаратуразнаўцы Мікалая Янчука, а таксама літаратараў-„нашаніўцаў" М. Арла (Сцяпана Пятэльскага), Уладзіміра Хлябцэвіча і іншых дзеячаў маладабеларускага руху пачатку XX стагоддзя. Сокамі гэтай зямлі поены і таленты многіх прадстаўнікоў сучаснай польскай культуры, сярод іх пісьменніка Тадэвуша Канвіцкага, філолага Васіля Белаказовіча, аўтара многіх прац па славянскай кампаратывістыцы, уключаючы доследы аб польска-беларускім, усходне-заходнеславянскім культурным пагранічча. Глыбокае дыханне глебы, яе жыватворная цеплыня падкормліваюць лірычныя памкненні майстроў пяра, скіраваныя ў першую чаргу да сваёй прыярытэтнай малой айчыны: да вёсак Бандары Алеся Барскага і Мора Віктара Шведа, Дубічы-Царкоўныя Яна Чыквіна, да мястэчак Белавежа Георгія Валкавыцкага і Крынкі Сакрата Яновіча, Бельск-Падляшскі Надзеі Артымовіч, Гайнаўка Міры Лукшы. Бадай што кожны з іх, ужо, пераважна, гараджанін, вяртаецца думкамі ў роднае, здараецца апусцелае гняздо, „страчаную Аркадыю", занава перажываючы свае вытокі — пачаткі і сэнсавыя крытэрыі творчага шляху.

„Цяпер я выразна бачу, — прызнаецца ўзмужнелы паэт Ян Чыквін, — што не паспеў закончыць сваё дзяцінства ў тых прыроджаных натуральных умовах. І аглядаючыся ў дзіцячае мінулае не толькі настальгічна перагортваю гэтыя чуллівыя дні і гады, ды — здаецца — дапісваю да сваіх старонак тое, што не паспеў тады перажыць. Так вось гэта і ёсць самая чыстая крыніца майго натхнення. Хоць і не адзіная". (З размовы Яна Чыквіна з Тэрэзай Занеўскай: „Сляза пякучая айчыны. Творчы партрэт Яна Чыквіна", Беласток 2000, с. 155).

У паэтычных споведзях перад малой айчынай-калыскай нярэдка раскрываецца вялікая і горкая праўда аб яе павольным апусташэнні і патуханні ва ўмовах узрастаючай глабалізацыі, з нацыянальна-духоўным знясіленнем уключна — для нацыянальнай меншасці аб'ектыўна быццам бы і непазбежнага ды асабліва ранімага. Віктар Швед амаль сорак гадоў раней, сумуючы па аджываючых атрыбутах сялянскага побыту, стварыў здзіўляючы верш „Вятрак", па-свойму прадчуваючы купалаўскі матыў адыходзячай вёскі.

Найбольш адзінокі на свеце,
Аджыў, як відаць, я свой век,
З мяне насміхаецца вецер,
Пакінуў мяне чалавек.
Не рвуцца ў палёт мае крылы,
Шчаслівых не ўбачыць мне дзён,
Не хопіць, напэўна, ім сілы,
Каб з месца крануць мой жарон.

Совсем одинок я на свете,
Никак на исходе мой век.
С меня насмехается ветер,
Оставил меня человек.
Не рвутся ввысь крылья, как было,
Дичает в подножье трава.
И вряд ли пробудится сила,
Чтоб сдвинуть мои жернова.

(пераклад: Аляксей Каўка)

Дык што ж, ветракі аджываюць, аджылі сваё. Аднак асталіся і зноў жа родзяцца паэты-Дон Кіхоты, здольныя полымем гарачых стымулаў трывожыць, апякаць разленівелае ўсведамленне, аздараўляць заняпалыя душы. Часам занадта прагорклае, аднак жа аздараўляючае гэтае лячэнне, у кожным выпадку працвяражаючае ад ілюзорных спакус цывілізацыі, нярэдка абыякавае да чалавечай індывідуальнасці, яе нацыянальнай тоеснасці:

Ці мы не станемся халопам
Пад нейкім новым зноў прымусам.
Ці па дарозе у Еўропу
Не знікнуць цалкам беларусы.

(Віктар Швед, „Двухтысячны год")

Гэтай паэзіі, як можна заўважыць, не характэрныя гучныя дэкларацыі, трубныя заклікі. Яна не столькі заклікае, колькі востра пытаецца, пакідаючы чытачу дадумваць хвалюючыя яе пытанні-адказы, выкліканыя, як справядліва заўважыў англійскі даследчык, „мінорным, нават змрочным настроем" многіх служыцеляў музы. (Арнольд МакМілін, „Яркае адценне чорнага: Паэзія Надзеі Артымовіч", „Annus Albaruthenicus", Крынкі 2003, с. 156.)

Нельга пры гэтым не ўлічваць спецыфічнага становішча свядомага беларуса ў дадзенай дыяспары, дзе беларуска-нацыянальны выбар — дакладней удзел інтэлігентаў-адзіночак, да якога выбару лакальная супольнасць адносіцца абыякава, калі не варожа. Паколькі сама яна знаходзіцца ў каматозных абставінах „тутэйшасці", заліванай штодзень польскамоўнай стыхіяй. Адтуль непазбежны комплекс непаўнацэннасці свядомага беларуса, псіхалагічная адзінота ізгоя, дзіўнага чужака сярод сваіх. Гэтая праблема нацыянальнай адчужанасці да крайнасці выяўлена ў лірыка-філасофскіх нарысах Сакрата Яновіча. Падаем пару характэрных вытрымак:

„Чатыры дні ў Крынках, чужацкае ўжо, каланіяльнае мястэчка, фанатычна-польскае (за беларускую гаворку можна ў зубы дастаць!)". Не знаходзіць аўтар суцяшэння і ў радзімай метраполіі, азмрочанай той жа хмарай безнадзейнага асімілятарства, пры якім публічнае дэкларавание беларускай мовы не раз выяўляецца хамскай рэплікай канцылярскіх чыноўнікаў („Говорите нормальным языком..."). „Трагічна было слухаць мінскіх дзяўчатаў: плюс-мінус 300 інтэлігентных дамоў у Беларусі карыстаецца роднай мовай, барацьба ўжо не за аднаўленне беларускасці Беларусі, але за цярпімасць да беларускага ў Беларусі". (Сакрат Яновіч, „Дзённікі (1987-1995)", Беласток 1997).

Таксама трагічнае пачуццё „страчанай" айчыны на сваёй зямлі перадаюць пранікліўя строфы паэта:

Я вельмі самотны — айчыны не маю.
Матчынай песні.

(Ян Чыквін, „Паэт на чужыне")

Я так одинок — не имею отчизны.
Материнской любви.

(пераклад: Аляксей Каўка)

Аднак жа. Змрочны фон перажыванняў не зусім цісне пакутлівае сэрца мастака. Промні невыказнага святла пранізваюць цьмяную цемрадзь зямной неўпарадкаванасці, сагравaючы і акрыляючы змучаныя людскія істоты.

І хоць:

У гэтым доме (...)
толькі кожную ноч
цямней на яшчэ адну
ноч.

(Міра Лукша, „Замова")

Ды прасветленая душа непераможная ў сваім прыўзнятым парыве да зорных вышынь прыгажосці і вечнасці:

У белую нядзелю
паедзем у свет
на срэбнай кабылцы
у вуздэчцы з зорак.

(Міра Лукша, „Ёсьць")

Святланоснымі токамі пульсуюць і паэтычныя імпрэсіі Надзеі Артымовіч:

веру ў вечнае хараство
веру ў адно нявыказанае слова
веру ў белае маўчанне.

(Надзея Артымовіч, „Сезон у белых пейзажах")

Гэтыя ж светлыя азарэнні кіруюць стылем Яна Чыквіна — з яго жыццёсцвярджальнай альтэрнатывай мярцвячыны і несуцешнасці:

Мы жывём. Якая радасць гэта!
Мы жывём, як антытэза да прадметаў...

(Ян Чыквін, „Светлы міг")

„Вартавыя памяці" („Strażnicy pamięci") — так назвала крытык Тэрэза Занеўская сваю кнігу аб беларускіх пісьменніках Польшчы. А сапраўды яны трымаюць нялёгкую высакародную вахту памяці і духоўнага бяссмерця народа, гарманічна ўплятаючы сваю рэгіянальную мелодыю ў еўрапейскі аркестр музыкі і слова, пацвярджаючы гэтым унутраную жыццеўстойлівасць і супраціўленне Культуры. І пакуль пранікліўя вартавыя не здрадзілі свяшчэннаму прызванню — нацыя жывая, творчая ніва пладаносіць — нават калі і ў віртуальнай прасторы, у літаратурна-міфалагічным вобразе.

Словам, вахта трывае. Усё пад тымі ж нятленнымі скрыжалямі: „Не пакідайце"; „Людзьмі звацца".

Аляксей КАЎКА

З рускай мовы пераклаў Віктар ШВЕД

Янка Купала і беларуская эміграцыя

(працяг з 19-га н-ра)

13 снежня 1942 года ў Чыкага (ЗША) адбыўся першы вечар памяці Янкі Купалы, на які сабраліся беларусы з многіх штатаў. А паніхіду па песняру адслужылі яшчэ раней — 11 кастрычніка 1942 года.

Каб увекавечыць памяць генія беларускага народа, класіка нашай літаратуры, педагагічная рада першай беларускай гімназіі ў Баварыі прысвоіла гімназіі імя Янкі Купалы і стварыла пры ёй фонд імя Купалы. Пра гэтую падзею Іна Рытар-Каханоўская згадвала так: „У той дзень адбылася акадэмія. На сцэне вісеў вялікі партрэт Я. Купалы, намаляваны спэцыяльна для ўрачыстасьці мастаком Д. Чайкоўскім. З гэтага партрэту заказалі клішэ, зь якога скаўцкае выдавецтва зрабіла дзьве сэрыі адбіткаў: адну — для праграмак акадэміі, другую — для паштовак. Выкладчык беларускай мовы й літаратуры А. Каханоўскі прачытаў рэфэрат пра жыцьцёвы й творчы шлях Я. Купалы. Пасьля рэфэрату быў канцэрт. Кампазытар Мікола Куліковіч для гэтага канцэрту напісаў музыку да вершаў Я. Купалы „Я ад вас далёка". Песьню дуэтам выконвалі вядомыя салісткі Менскага Опэрнага Тэатру — Натальля Куліковіч (Чэмярысава) і Барбара Вержбаловіч. Акампаньяваў ім на піяніна сам кампазытар. Песьня гэтая мела надзвычайны посьпех. Перажываньні паэты, разлучанага з родным краем, спляліся з пачуцьцямі слухачоў, адгукнуліся болем у іхных сэрцах". (Ян Максімюк, *Беларуская гімназія імя Янкі Купалы ў Заходняй Нямеччыне 1945-1950*, Нью Ёрк 1994, с. 81-82).

У 1940-50-х гадах мінулага стагоддзя да Янкі Купалы і яго творчасці беларускія эмігранты сталі вяртацца ўсё часцей і часцей. Актыўна адзначаюцца ўгодкі з дня яго нараджэння, смерці, юбілеі кніжак і асобных твораў, інсцэніруюцца яго камедыі і іншыя драматычныя творы. Восенню 1945 года ў Буэнас-Айрасе (Аргенціна) было заснавана Беларускае культурна-асветнае таварыства імя Янкі Купалы, а ў мясцовасці Камадора Рывадавія была адкрыта і бібліятэка імя Я. Купалы. 1 ліпеня 1948 года ў Парыжы таксама з'явілася беларуская бібліятэка імя Янкі Купалы. У ліпені 1952 года каля вадаспада Ніягара адбылася Першая сустрэча беларусаў Паўночнай Амерыкі. На ёй былі ўшанаваныя 10-я ўгодкі смерці Янкі Купалы. А Вінцэнт Жук-Грышкевіч выступіў з дакладам пра песняра. Дарэчы, пазней спадар Жук-Грышкевіч абароніць доктарскую дысертацыю на тэму „Лірыка Янкі Купалы" на філасофскім факультэце Атаўскага універсітэта ў Канадзе.

Беларуская моладзь на эміграцыі ў 40-60-я XX стагоддзя была вельмі актыўнай. Юнакі і дзяўчаты захапляліся не толькі паэзіяй нашага класіка, але і яго драматычнымі творамі. Не было такой вечарыны, дзе б беларуская моладзь не ладзіла спектаклі і інсцэніроўкі па п'есах Янкі Купалы. У лагеры Ватэнштэт (Германія) 24 сакавіка 1946 года быў пастаўлены абразок „На пасе", а на наступны год — быў інсцэніраваны верш Купалы „Цару неба і зямлі", некалькі разоў тут ставілася „Паўлінка". У 1951 годзе ў Нью-Йорку драматычным гуртком беларускай моладзі быў арганізаваны і пастаўлены мантаж па творах Купалы „Пясьнярскім Шляхам" пад кіраўніцтвам Наталлі Орса. А праз тры гады была інсцэніравана паэма „Курган" (рэжысёр Наталля Орса). У 1960 годзе ў Саўт-Рывэры беларускім драматычным гуртком была пастаўлена „Паўлінка" (рэжысёр Ірэна Цупрык-Жылінская), якая шмат разоў паказвалася для беларусаў і людзей іншых нацыянальнасцей.

У многіх краінах свету з дакладамі і рэфератамі, прысвечанымі жыццю і творчасці Янкі Купалы выступалі беларусы-эмігранты Масей Сяднёў, Вітаўт Кіпель, Антон Адамовіч, Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Язэп Малецкі, Уладзімір Клішэвіч, Алесь Алехнік, Станіслаў Станкевіч, Аляксандр Калодка, Уладзімір Сядура і іншыя беларускія пісьменнікі і гісторыкі. Творчасць Янкі Купалы свядома абуджала беларусаў на чужбіне, натхняла іх, дапамагала ім адчуваць сябе як на Бацькаўшчыне. Янка Купала быў і застаўся сімвалам духоўнае сілы беларусаў. Праўда, у канцы 1940-х і ў пачатку 1950-х гадоў, як і раней, далёка ад Радзімы не заўсёды хапала паэтычнай Купалавай спадчыны, адпаведных вершаваных тэкстаў, ды і наогул многіх твораў нашага песняра. Таму ў Ватэнштэце, Міхельсдорфе і Мюнхене ў 1946-1953 гадах асобнымі кнігамі былі выдадзены „Курган", „Магіла Льва", „На Куцьцю", „Раськіданае Гняздо" і „Тутэйшыя" Янкі Купалы. А ў 1955 годзе ў выдавецтве „Бацькаўшчына" (Нью-Йорк — Мюнхен) свет пабачыў вялікі том паэзіі Янкі Купалы „Спадчына" з уступным словам Станіслава Станкевіча, падрыхтаваны Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Гэта была вялікая літаратурная падзея для ўсёй беларускай эміграцыі ў свеце. Пра выхад „Спадчыны" напісалі многія беларускія эміграцыйныя выданні. Адгукнулася на выхад паэзіі Янкі Купалы і небеларуская прэса, у прыватнасці, амерыканскія, англійскія, нямецкія, польскія, украінскія і французскія выданні. Газета „Бацькаўшчына" 11 лютага 1956 года пісала, што „«Спадчына» годна рэпрэзентуе Беларусь". Некалькі перадач пра выхад паэзіі Янкі Купалы падрыхтавала радыё „Вызваленьне".

Праз 30 гадоў пасля выхаду „Спадчыны" Янкі Купалы ў Мюнхене, дзякуючы ўсё ж таму Беларускаму інстытуту навукі і мастацтва ў Нью-Йорку, з'явілася выдатная бібліяграфічная праца, складзеная Вітаўтам і Зорай Кіпелямі, якая называецца „Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе". Ва ўступе да яе напісана: „Укладальнікі прапанаванае бібліяграфіі імкнуліся зарэгістраваць усё, што пісалася пра Купалу й Коласа ў беларускамоўным друку на Захадзе, паза краінамі савецкага блёку. У меру даступнасьці матэрыялаў рэгістравалася й тое, што пісалася аб паэтах у беларускім друку былой Заходняй Беларусі, Літвы, Латвіі, Чэхаславаччыны ды Савецкай Беларусі, ня ўлічанае папярэднімі бібліяграфіямі".

Перафразіраваўшы радкі Станіслава Станкевіча з уступнага слова да мюнхенскай „Спадчыны" Янкі Купалы, хочацца сказаць, што роля і значэнне Купалы ў беларускай літаратуры вымяраюцца двума аспектамі ягонае творчасці: ідэйным і літаратурна-мастацкім. Гэтыя два моманты і надаюць Янку Купалу цэнтральнае і вядучае месца ў беларускай літаратуры, а таксама ў нашым сённяшнім жыцці і ў жыцці ўсёй беларускай эміграцыі XX стагоддзя.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПОЛЬСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРАКЛАДАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ

Польскія паэты — беларускім дзецям

У Мінску з'явілася арыгінальная кніга, як па змесце, так і па мастацкім афармленні беларускай мастачкі Алены Карповіч. Кніжка называецца „Качка-дзівачка". У анатацыі да яе напісана, што ў кнізе беларускія дзеці, іх мамы, таты, бабулі і дзядулі знойдуць вершы, забаўлянкі-прыбабунькі, якія даўно палюбіліся польскай дзятве.

Сапраўды гэта так. Бо кнігу склалі вершы польскіх паэтаў XIX — пачатку XXI стагоддзяў у перакладзе на беларускую мову Лявона Баршчэўскага, Уладзіміра Сіўчыкава, Рыгора Барадуліна, Анатоля Вялюгіна, Сяргея Дзяргая, Пятруся Макаля, Уладзіміра Мархеля, Алега Мінкіна.

Кніга „Качка-дзівачка" двухмоўная: вершы ў ёй пададзены па-польску і ў перакладзе на беларускую мову. Яна распачынаецца творамі Уладзіслава Сыракомлі і Марыі Канапніцкай. Вось як, напрыклад, гучыць па-беларуску і па-польску верш Марыі Канапніцкай „Па-та-тай, па-та-тай...":

Арыгінал:

Pataj, pataj,
Pojedziemy w cudny kraj!
Tam, gdzie Wisła modra płynie,
Szumią zboża na równinie,
Pojedziemy, pataj...

У перакладзе Лявона Баршчэўскага:

Па-та-тай, па-та-тай,
Едзьма ў поўны цудаў край!
Там, за Віслай-ракою
Поле шэпча збажыною.
Едзьма, едзьма, па-та-тай...
Як завецца гэты край?

Шырока прадстаўлена ў зборніку дзіцячая паэзія Юльяна Тувіма, Яна Бжэхвы, Дануты Вавілаў. Самымі маладымі аўтарамі зборніка з'яўляюцца польскія паэты Тэрэса Томся і Дарота Гельнер. У адзін з раздзелаў кнігі ўключаны і вершы невядомых польскіх аўтараў. Творы гэтыя падобныя на фальклорныя:

Шарык, шарык-малютка,
Падрастай хутка-хутка!
Ён расце — бярэ аж страх,
Перадзьмуўся — і ба-бах!

Наогул, у апошні час вельмі шмат перакладаецца польскай літаратуры на беларускую мову. Нядаўна ў Мінску адбылася презентацыя яшчэ адной кнігі польскіх паэтаў для дзяцей пад назовам „Каляровая карова". Пераклад на беларускую мову каля двухсот вершаў трыццаці пяці польскіх паэтаў і ўкладанне здзейснены навукоўцам, паланістам, супрацоўніцай Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Інесай Кур'ян. У кнігу ўвайшлі лепшыя творы польскай паэтычнай творчасці для дзяцей і юнацтва пачынаючы з XVIII стагоддзя і па цяперашні час. Акрамя польскіх паэтаў, у кнізе змешчаны і вершы польскамоўных паэтаў, якія нарадзіліся на Беларусі — Адама Міцкевіча, Уладзіслава Сыракомлі, Юзэфа Крашэўскага і іншых. Гэтае выданне таксама двухмоўнае, якое суправаджаецца біяграмамі і тэматычным указальнікам.

Па-беларуску загучалі Ваячак і Гурэц-Расіньскі

З перакладамі вершаў Рафала Ваячка на беларускую мову Хрысціны Граматовіч я ўпершыню пазнаёміўся, чытаючы часопіс „Правінцыя", які, на вялікі жаль, ужо не выходзіць. І вось нядаўна ў Мінску свет пабачыла асобная кніга яго твораў па-беларуску ў перакладзе Вальжыны Морт. Кніга называецца „Мёртвы сэзон". Вершы ў кнізе надрукаваны ў арыгінале і ў перакладзе.

Рафал Ваячак (1945-1971) — трагічная легенда польскай паэзіі. Ён скончыў жыццё самагубствам 11 траўня 1971 года, яму было 26 год. Пры жыцці надрукаваў два томікі сваіх вершаў. Яго наватарскія і нонканфармісцкія вершы змянілі аблічча сучаснай польскай лірыкі. Вось адзін верш з кнігі „Мёртвы сэзон". Ён мае назоў „Жаноцкасць":

Быць мужчынам — значыць біць жанчыну.
Цалкам згодная й твар падстаўляю.
Пільна слухаю, як клянеш маю маці,
але крыўдаваць не бачу ніякай прычыны.
Ніколі не скажу табе слова супраць,
хоць мяне ты й лаеш увесь час са злосцю.
Для цябе распранаюся, ты смяешся.
Слушна — грудзі малыя, скура ды косці.
Сама смяюся й табе дазваляю,
ці ёсць што агіднейшае за мае шнары?
Не пытаю, ці вернешся ты дадому.
Калі вяртаешся, дзе ты быў, не пытаю.
Дзівіся, калі кажу, што кахаю,
бо кахаць цябе — быць заўчасна ўдавою.

„Райская яблыня" — зборнік вершаў яшчэ аднаго польскага паэта Яна Гурэц-Расіньскага, які нарадзіўся ў 1920 годзе на Гродзеншчыне, таксама нядаўна выйшаў у Мінску. Вершы пераклаў на беларускую мову Сяргей Законнікаў.

Цікавай з'явай у беларуска-польскіх літаратурных сувязях стаў выхад кнігі „Дванаццаць польскіх апавяданняў" у перакладзе Андрэя Хадановіча. Кніга выйшла з друку ў Мінску. У ёй прадстаўлены 10 польскіх празаікаў з 20 апавяданнямі на любы густ.

(сч)

Дэбют з „Нівай” — АЛЕСЬ ЯЖЭВІЧ

Алесь Яжэвіч — нарадзіўся ў 1964 годзе на Гродзеншчыне. Сярэднюю адукацыю закончыў у Валожыне. Затым паступіў у Мінскі дзяржаўны інстытут замежных моў. Зараз жыве ў Краснаполлі, дзе працуе настаўнікам.

Нашчадкам

Аніштo беларусу не трэба.
Ўсё, што меў, ён даўно ўжо згубіў.
Незалежнасць звалілася з неба —
Без яе б ён цудоўна пражыў.

Ён інстынктам прыкуты да поля.
Ўся спадзеўка яго — на мазоль.
Што сцяг-герб, што там воля-няволя?
Гной б растрэсці — дык будзьме
хлеб-соль.

І трасуцца рабочы й сялянка,
Ціхі стогн напаўняе абшар.
Узышла пустазеллем трасянка,
Вілы з гноем — іх спадчынны дар!

2001

ДА АГІТАЦЫІ
* ЗА БЕЛАРУСЬ *

— За Беларусь, але без Мовы! —
І ўсе хвалебныя прамовы,
Ўся паліграфія
І псальмапенне —
Ёсць ЭПІТАФІЯ
І галашэнне.

15.03.06

МОВА — 2006

Хіба ж Мова мая бутафорная?
Хіба ж Мова мая неразвітая?
Яна — самая бездакорная,
Дасканалая і масцітая!

Мова — княжацкая, самабытная,
Кроўю лепшых сыноў палітая.
Мілагучная і гранітная,
Мова кніжная, самавітая.

Быццам маці — адзіная, слаўная,
І як зорачка, непаўторная...
Не рабочая, хоць дзяржаўная.
Сувенірная!, а не бутафорная.

16.03.06

МОВА — 2007

Бесценна помощь братней Руси.
Мы с нею сделали союз.
Как благодарность, в Беларуси
По-русски молвит беларус.

По-русски в армии присяга,
На русском спрашивает врач,
Поёт, домой идя, трудяга
И диктор телепередач.

Милиция, прокуратура
Русскоязычны как Закон.
Великорусская культура
Берёт любой интерферон.

Она повсюду, в каждой хате,
На улице, в суде — везде!
Но... что ответить мне дитяти:
— Где НАШ язык? Дзе Мова? Дзе?

14.01.07

Радзіме

Ты хварэеш, Радзіма, і подых Твой цяжкі.
Не жывеш, бавіш час у самотнай журбе.
Адняло Табе Мову, на целе — мурашкі.
Траціш Памяць, Свядомасць... Ты траціш Сябе.

Чорным вусам схапіў цябе вірус смяротны.
Як застацца Табе самабытнай, жывой?
Памагчы можа лекар-пустэльнік народны,
Што напоіць гаючай крынічнай вадой.

Мова — вось панацэя, святая крыніца!
Прыхініся, жыві ў ёй, купайся, як гусь.
Вернеш Памяць, прыгожыя сны будуць сніцца,
Лекар ціха ўсміхнецца: Жыве Беларусь!

1996

Сцёб

1. Няма на свеце гэткіх хлусаў,
Каб ахмурылі беларусаў.

2. Мы маем шмат эканамістаў
І прэчкі гонім папулістаў,

3. Хто поспех занядбаць гатовы,
Здабыты без ужытку Мовы.

4. Яны без Мовы як без Бога,
Ды, дзякуй Богу, іх нямнога.

5. "Працоўных мазалёў" ня маюць —
Усё на Мове размаўляюць...

6. Самаакупнасць — вось задача.
Якая з Мовы нам аддача?

7. Адно плаці за пераклады —
Хто гэткай Мове будзе рады?

8. Чым меней Мову прафундуем —
Тым болей ясляў, школ збудуем.

9. Ну, знікне Мова... Дойдзе справа —
„Язык" мы возмем злева... справа.

10. І зажывём, хай нашых знаюць!..
Габрэі тут адпачываюць.

12.02.07

Gotthold Ephraim Lessing
ГОТГАЛЬТ ЭФРАЙМ ЛЕСІНГ
DIE SCHÖNE VON HINTEN

пераклад з нямецкай

Спакусніца ззаду

— Глянь, сябар, глянь, хто там гуляе?
Паненка — вочы адбірае.
Які цудоўны стыльны ўбор,
Ну а хада, дык проста ўзор!
Чаруе медным бляскам волас,
І мілагучны, мабыць, голас.
Фігурка зграбная яе
Цнатлівасць самкі выдае.

— Хутчэй, сябрук, зірнуць я мару
Ці так яна прывабна з твару?
Бо калі ззаду меркаваць —
Ідзе Венера там, відаць.
Паненка клубам павярнула.
Ура! На нас яна зірнула.
За кім мы беглі? — За старой
Ва ўборы панны маладой.

1987

* * *

Я не вучыўся, я не спаў,
З вачмі адкрытымі ляжаў
І бачыў вобраз — нібы партрэт.
Я быў шчаслівы, я кахаў,
Я так салодка пазяхаў,
Я ўжо вітаў за тры-дзевяць планет.
Агні зарніц —
спатканне-бліц.
Любоў — букеты таямніц.
Тут мне прыйшло тваё пісьмо,
Мне дух, мне Мову заняло,
Праз лівень поту чытаю ліст.
Гляджу прыгожае кіно:
Ты вершам пішаш пра адно,
Што я душы тваёй чароўны каланіст.
Агні зарніц —
спатканне-бліц.
Любоў — букеты таямніц.
Пустынным стаў мне інстытут,
Лячу сказаць табе: „Салют!"
Што без цябе я ўжо не жылец.
Вакзал — зліюцца сэрцы тут ! —
Гром стрэліць — Гітлеру капут! —
А ты мая, і гутарцы канец.
Агні зарніц —
спатканне-бліц.
Любоў — букеты таямніц.
Не злій вакзал. Віна не ў ім,
А ў тым, што ты прыйшла з другім.
І мая ружа ўпала ніц.
Дзяцюк твой сябрам быў маім,
Сябе ж я суцяшаю ў тым:
Не горшы мой з сюрпрызаў маладзіц!
Агні зарніц —
спатканне-бліц.
Любоў — букеты таямніц.

1987

Другой

— Ты даруй мне, прыгажуня,
Сёння я не твой фрэнд-бой.
Зоркі-чэрці ў час бязлуння
Светляць сцежку да другой.

Сёння мы Венеры ззянне
Бачылі не раз з табой.
Рамантычнае спатканне
Абяцае быць з другой.

Па зямлі, цяплом налітай,
Дождж прайшоўся паласой.
Там стаім мы пад ракітай,
Пад адной, і пад другой...

Падымае спелы колас
Жнейка вопытнай рукой.
Стоп! Знаёмы чую голас:
— Што, заснуў пасля другой?

1987

JOHANN WOLFGANG GOETHE
ЁГАН ВОЛЬФГАНГ ГЁТЭ
WANDERERS NACHTLIED

пераклад з нямецкай

Калыханка вандроўніка

Ціха над гарамі
Лёг змрок,
Па-над лясамі
Вецярок
Не хоча больш гуляць;
Птушкі маўчаць у лесе.
Хутка ўжо, ўрэшце,
І ты будзеш спаць.

14.03.06